Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

І. І. САДОЎСКАЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА НАСТАЎНІКА Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

Частка 1

МІНСК 2007

УДК 37(091)(075.8)
ББК 74.03я70
С143

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэцэнзенты:*
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры сучасных еўрапейскіх моў БДПУ А.Л. Еўдакімава*
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры педагогікі БДПУ А.А. Прохараў*

*Пад рэдакцыяй С.В. Снапкоўскай*

Садоўская, І.І.
С143 Прафесійнае майстэрства настаўніка ў педагагічнай думцы Беларусі ў першай трэці ХХ стагоддзя: метад. рэк. У 2 ч. Ч.1. / І.І. Садоўская; пад рэдакцыяй С.В. Снапкоўскай. – Мінск: БДПУ, 2007. – 51 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У дапаможніку змешчаны матэрыял па праблеме прафесійнага майстэрства настаўніка ў першай трэці ХХ ст. Рэканструявана эвалюцыя паняцця «педагагічное майстэрства». Прааналізаваны і абагульнены ўяўленні аб прафесійным майстэрстве, спосабах яго фарміравання і шляхах удасканалення ў тэарэтычный педагагічнай думцы Беларусі першай трэці мінулага стагоддзя. Прыводзяцца тэсты і творчыя заданні для самастойнай працы над тэкстам.

Адрасуецца слухачам спецыяльнага вучэбнага курса, студэнтам і ўсім, хто цікавіцца пытаннямі прафесійнага майстэрства настаўніка ў Беларусі ў першай трэці ХХ ст.

**УДК 37(091)(075.8)**
**ББК 74.03я70**

**© Садоўская, І.І.**
**© БДПУ, 2007**

# Уводзіны

Праблема падрыхтоўкі настаўніка, фарміравання і ўдасканалення яго прафесійнага майстэрства з’яўляецца актуальнай для сучаснай педагагічнай навукі. Усебаковае вывучэнне абазначанага пытання магчыма на аснове гістарычнай рэканструкцыі, гэта значыць шляхам вывучэння генезісу праблемы майстэрства настаўніка і яе практычнай рэалізацыі ў вывучаемы перыяд. Веданне мінулага дапамагае глыбей і рознабакова асэнсаваць сучаснасць, зпрагназаваць будучыню, перасцерагае нас ад магчымых памылак. Ад прафесіяналізму настаўніка, пастаноўкі справы навучання залежыць якасць ведаў, што атрымліваюць школьнікі, развіццё здольнасцей аналізаваць, рабіць вынікі, правільна і лагічна думаць [4, с. 167–168].

Сучасная гісторыка-педагагічная літаратура трактуе паняцце «майстэрства» як найвышэйшы ўзровень прафесійных уменняў у вызначанай галіне, які дасягнуты на аснове вопыту, гібкіх навыкаў і творчага падыходу [40, с. 293]. Сутнасць дадзенага паняцця раскрываецца і як глыбокае разуменне педагагічнай справы, спалучанае з развітым уменнем ажыццяўляць эфектыўныя дзеянні ў якім-небудзь відзе прафесійных альбо аматарскіх ведаў [44, с. 241]. Прафесійнае майстэрства неразрыўна звязана з дзейнасцю суб’екта і дасягаецца пры ўмове паспяховага авалодання ёю, пры пастаянным самааналізе ім сваёй працы і самаўдасканаленні.

Крыніцай фарміравання і дасягнення майстэрства, як адзначаецца ў гісторыка-педагагічных даследаваннях, у першую чаргу з’яўляецца развіццё настаўнікам унутранай патрэбнасці самаўдасканалення, самаарганізацыі і самарэалізацыі сваіх якасцей і ўменняў. Такі акцэнт на абазначаную праблему прасочваецца і ў гісторыі айчыннай педагагічнай думкі.

Цікавасць прадстаўнікоў педагагічнай думкі Беларусі да праблемы прафесійнага майстэрства настаўніка ў пачатку XX ст. абумоўлівалася прад’яўленнем новых патрабаванняў да якасці адукацыі, узрослай патрэбнасцю грамадства ў настаўніках-прафесіяналах. Крытыка існаваўшых метадаў і прыёмаў навучання і выхавання, непрымальнасць іх для новай школы выклікалі неабходнасць перагляду дзейнасці настаўніка, азначыўся новы падыход да вызначэння яго прафесіяналізму [56, с. 11]. Уяўленні аб майстэрстве настаўніка, што склаліся к гэтаму часу, паслужылі трывалай асновай для далейшай распрацоўкі праблемы. Гэта садзейнічала выяўленню крытэрыяў і ўзроўняў, шляхоў і спосабаў фарміравання, развіцця і ўдасканальвання прафесійнага майстэрства настаўніка.

Асноўваючыся на ідэях такіх прадстаўнікоў айчыннай педагагічнай думкі, як Францыск Скарына, Сымон Будны, Сімяон Полацкі, Казімір Нарбут і інш.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

педагогі дарэвалюцыйнай Беларусі прыўнеслі ў бачанне гэтай праблемы свае погляды, тлумачэнні. Тэрмін «педагагічнае майстэрства» не набыў яшчэ шырокага ўжывання, але глыбокае разуменне вучонымі-педагогамі дарэвалюцыйнай Беларусі ўзаемасувязі выкладчыцкай працы і вынікаў вучэбна-выхаваўчай справы дазваляюць нам меркаваць аб тым, што разумелася пад паняццем «педагагічнае майстэрства».

Пасля кастрычніка 1917 г. пачаўся новы этап у развіцці сістэмы адукацыі Беларусі. Пострэвалюцыйны час увайшоў у гісторыю школы як перыяд інтэнсіўных пошукаў новых метадаў выхавання і навучання, накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы. Праблема падрыхтоўкі настаўнікаў і фарміравання іх педагагічнага майстэрства разглядалася ў працах тэарэтыкаў педагогікі Беларусі ў некалькі іншым ракурсе. Перабудова ўсёй сістэмы школьнай адукацыі, а таксама нацыянальная палітыка, пачатак якой быў пакладзены, як адзначалася на XI з’ездзе Камуністычнай партыі Беларусі, яшчэ ў 1917 г., вызначалі накірункі навуковых пошукаў айчынных педагогаў [1, с. 415]. Паражэнчы настрой пасля першай сусветнай вайны і натхняючыя рэвалюцыйныя падзеі сталі тымі сацыяльна-гістарычнымі ўмовамі, калі пачыналі закладвацца асновы нацыянальнай школы [59, с. 54]. Насельніцтва не заставалася ў баку ад стварэння нацыянальнай школы. У якасці сведчання выступаюць шматлікія звароты ў Беларускую школьную раду з пажаданнем, каб «дзеткі вучыліся ў беларускіх школах» [59, с. 54].

20-я гг. характарызуюцца адноснай стабільнасцю ў развіцці школы. Гэты перыяд у гісторыка-педагагічнай літаратуры прынята лічыць «залатым перыядам» айчыннай педагогікі. Шмат яскравых асоб, апанаваных духам творчага пошуку, вылучаліся яркасцю і нестандартнасцю мыслення, заззялі на навуковым небасхіле [11, с. 29]. «Залаты перыяд» у гісторыі педагогікі Беларусі пакінуў нам важкую педагагічную спадчыну. Ідэі, погляды і тэорыі многіх педагогаў-тэарэтыкаў актуальны і ў нашы дні. Віднейшыя прадстаўнікі педагагічнай думкі Беларусі гэтага часу, як і іх папярэднікі, пры тэарэтычнай распрацоўцы асноў прафесійнага майстэрства настаўніка адстойвалі неабходнасць індывідуальнага падыходу ў навучанні і выхаванні дзяцей, уліку і развіцця іх здольнасцей і інтарэсаў. Асноўнымі каштоўнасцямі педагогаў лічыўся шырокі кругагляд, глыбокія веды вучэбнага прадмета і валоданне методыкай яго выкладання, імкненне да штодзённага самавыхавання і самаадукацыі, разумная любоў да дзяцей [50, с. 121].

У дапаможніку аўтар імкнуўся рэканструяваць эвалюцыю паняцця «педагагічнае майстэрства» на аснове прац, ідэй і поглядаў славутых вучоных-асветнікаў Беларусі, раскрыць, прааналізаваць і абагульніць уяўленні педагогаў-асветнікаў Беларусі аб педагагічным майстэрстве настаўніка, спосабах яго фарміравання і шляхах удасканалення. Упершыню

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прааналізаваны і абагульнены вопыт фарміравання настаўніцкага майстэрства ў тэарэтычнай педагагічнай думцы Беларусі першай трэці мінулага стагоддзя.

Тэсты да раздзелаў і творчыя заданні дапамогуць мэтанакіравана арганізаваць і якасна ажыццявіць самастойную працу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## I. Гістарычны агляд станаўлення паняцця «педагагічнае майстэрства» ў гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі (да канца XIX ст.)

Першае згадванне тэрміна «майстар» і азначэнне дзейнасці настаўніка як «майстэрства» з’явілася ўжо ў сярэдзіне XIII ст. У гэты час на тэрыторыі Кіеўскай Русі школы існавалі ва ўсіх буйных і дробных гарадах, большая частка іх арганізоўвалася пры цэрквах і манастырах. Навучанне ў іх вялося царкоўнымі служыцелямі – папамі, дзякамі, панамарамі. У гарадскія школы для выкладання запрашаліся «знатныя» майстры. Менавіта ў гэты час, на думку гісторыкаў Н. А. Канстанцінава і В. Я. Струмінскага ў сярэдзіне XI ст., з’явілася прафесія настаўніка, якога называлі «майстрам граматы» [24, с. 7].

У XIV – XV стст. школьная справа разгарнулася ў буйных феадальных маёнтках. Для навучання дзяцей у гэтых школах прываблівaліся вандруючыя настаўнікі, якіх таксама называлі «майстрамі граматы» [3, с. 12]. Яны вучылі дзяцей чытанню, пісьму, ліку, сваю галоўную прафесійную задачу бачылі ў рэлігійна-маральным выхаванні дзяцей. У праяўленні ўмення навучаць дзяцей у духу багаслоўя, асновы якога былі закладзены ў багаслоўскай літаратуры, бачыўся ў эпоху сярэдневяковага феадалізму прафесіяналізм «майстра граматы».

Эпоха Адраджэння і Рэфармацыі ў Беларусі вядома дзейнасцю **Францыска Скарыны (каля 1490 – каля 1551 г.)** і **Сымона Буднага (каля 1530 – 13.01.1593 г.)**. Менавіта ў гэты перыяд (XVI – XVII стст.) пачало асэнсоўвацца значэнне педагогікі, настаўніцтва [16, с. 9]. Названыя прадстаўнікі айчыннай педагагічнай думкі не займаліся непасрэдна праблемай майстэрства настаўніка. Між іншым, дзякуючы распрацоўцы імі праблемы дасканалага чалавека ў цэлым, можна гаварыць і аб тых якасцях, якія павінны былі быць уласцівы асобе педагога-прафесіянала.

Асветніцкія ідэі пранізваюць чырвонай ніткай усе працы Францыска Скарыны: «Детемь малымь початокь всякое доброе науки, дорослымь помножение в науце» [51, с. 45]. У адной з прадмоў ён пісаў: «В сей книзе вси лекарства душевные и телесные зупол не знайдёте» і не агаварыўся, калі двойчы назваў сябе «в науках и в лекарстве учителем» [47, с. 117]. Сваю дзейнасць ён лічыў апостальскай [41, с. 96], паколькі «избранный муж, в лекарских науках доктор» аддаваў перавагу прафесіі доктара місію асветніка і маральнага прапаведніка, прысвяціў сябе служэнню «посполитому, доброму», «размножению мудрости, умения, опатрености (аўт. – опатреность – асцярожнасць, памяркоўнасць, разважлівасць), розуму і навуцы» [47, с. 74]. Друкаванне кніг Францыск Скарына пачаў з Псалтыра, які, на яго думку,

найлепшым чынам служыў практычнаму навучанню пісьменнасці і быў даволі шырокараспаўсюджаны ў народзе, на беларускай мове. Асветнік лічыў, што выданне кніг на роднай мове мае рашаючае значэнне ў развіцці адукацыі. І ў сувязі з гэтым сцвярджэннем ён прад'яўляў сваё патрабаванне да настаўніка: «Немногим учителем бывати, но более умети язык свой справовати; от него же все злые и добрые речи походят» [31, с. 9]. Францыск Скарына высока цаніў творчыя здольнасці, імкненне да асветы і самаўдасканалення, таму і сфармуляваў гуманістычную задачу як асноўную: «познания самого себя» [15, с. 49]. Базавай каштоўнасцю ў далейшым развіцці сваіх поглядаў на педагагічную дзейнасць Францыск Скарына лічыў Біблію, са зместам якой злучаны і толькі разам з ёй складаюць адзінае цэлае ўсе яго творы. На яе пісаннях ён асноўваў і распрацоўваў прадстаўленне аб ідэальным чалавеку – разумным, культурным і развітым, падрыхтаваным да выканання любой справы, бачыўшым сваё зямное прызначэнне ў служэнні людзям, распаўсюджванні гуманістычных ідэй эпохі Адраджэння, натхненні асабістым прыкладам на грамадскую актыўнасць. Галоўнае, на думку Францыска Скарыны, – удасканаленне і разуменне высокага зместу зямнога быцця і боскіх запаведзей, прызнанне перавагі духоўнай асалоды над другімі. «Да совершенен будет человек божий и на всяко дело добро уготован ...» [31, с. 10].

Фарміраванню прадстаўлення аб ідэальнай асобе **Сымон Будны** надаваў увагу ў працэсе педагагічнай працы. Асновай выхавання і самавыхавання асобы ў яго творах прызнавалася праца. Ён актуалізаваў прысутнасць нацыянальнага гонару і багатыя духоўная традыцыі ў беларускага народа. У «Катэхізісе», самым вядомым яго творы, гаворыцца аб развіцці адукацыі, культуры і мовы. Як і Францыск Скарына, ён прызнаваў самай галоўнай якасцю настаўніка веданне роднай мовы [6, с. 75].

Такім чынам, можна вылучыць наступныя базавыя каштоўнасці, якія былі характэрны для перыяду гуманізма і паслужылі асновай далейшай распрацоўкі патрабаванняў, прад'яўляемых да дзейнасці педагога:

- наяўнасць унутранай патрэбы інтэлектуальнага, маральнага, духоўнага і фізічнага самаўдасканалення;
- прызнанне свайго назначэння ў служэнні людзям, у распаўсюджванні перадавых ідэй свайго часу;
- імкненне сваёй працаздольнасцю натхняць на асабістую і грамадскую актыўнасць;
- гуманныя адносіны да дзяцей і любоў да іх;
- уменне развіваць у дзецях дапытлівасць і імкненне да свядомага засваення ведаў;
- прысутнасць нацыянальнага гонару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Існаваўшыя ў перыяд контррэфармацыі на тэрыторыі Беларусі езуіцкія школы вылучаліся сваёй дакладнай арганізацыяй, а таксама ажыццяўленнем сістэматычнай і строгай падрыхтоўкі настаўнікаў для выканання задач ордэна. Ордэнам было створана сваё вучэнне аб настаўніку, якое абгрунтоўвала патрабаванні, прад'яўляемыя да яго асобы [18, с. 27]. Патрабаванні асноўваліся на аўтарытэце настаўніка, які павінен быў валодаць наступнымі ўменнямі:

- ведаць кожнага выхаванца;
- уплываць на фарміраванне светапогляду выхаванца;
- адмыслова валодаць сваім голасам;
- быць добрым прамоўцам;
- умець арганізоўваць спаборніцтвы паміж навучэнцамі.

Асноўнымі кампанентамі яго дзейнасці вылучаліся наступныя: магчымасць забараняць, кіраваць і загадваць.

Далейшае развіццё паняцця «майстэрства настаўніка» і распрацоўка патрабаванняў да яго якаснай дзейнасці выразна прасочваецца ў станаўленні адукацыі і педагагічнай думкі на Беларусі ў другой палове XVII ст. Важкі ўклад у пабудову асноў беларускай педагагічнай навукі ўнёс выдатны прадстаўнік дадзенага перыяду, вядомы філосаф, паэт і драматург **Сімяон Полацкі (1629 – 25.08.1680 г.)**. Навучальны пачатак, на думку даследчыка Л. У. Званаровай, з'яўляецца дамінуючым у літаратурнай творчасці Сімяона Полацкага [16, с. 10.].

У кнігах «Обед душевный», «Вечеря душевная» ім былі выкладзены педагагічныя ідэі і абагульнены педагагічны вопыт. У прадмове да зборніка «Обед душевный» ён, як і Францыск Скарына, атаясамліваў сябе з доктарам, які «палит и режет», быў упэўнены, што «горячая и горькая» ежа духоўная паслужыць «во пользу народную» [43, с. 170], дапаможа выхаваць дасканалага чалавека. Сімяон Полацкі з'яўляецца адным з першых беларускіх педагогаў-асветнікаў, хто, звяртаючы ўвагу на існаванне праблемы ролі настаўніка і яго месца ў школе ў сваіх вершах «Учитель», «Учение», «Учитися и учити», «Учяй, а не творяй», «Мысль» і інш., акцэнтаваў праблему педагагічнага майстэрства: «Иже хощет, учитель человеком быти, долженствует три вещи всячески хранити, …» [58, с. 369]. Згодна з яго думкамі, толькі таго можна назваць настаўнікам, хто сам валодае дастатковымі ведамі, адмыслова выкладае свой прадмет, любіць сэрцам сваю працу і вучняў: «… Сия храняй учитель, благий наречётся, спасаяй человеки, сам богом спасётся» [58, с. 369]. Ён яшчэ не раскрываў сутнасць гэтага паняцця, ён толькі звяртаўся да яго, называючы якасці настаўніка і прад'яўляючы патрабаванні да яго прафесійнага майстэрства: умеласць, сцісласць і даступнасць у выкладанні матэрыялу, праўдзівасць, здольнасць сваім прыкладам схіляць дзяцей да добрых спраў, быць для іх аўтарытэтам і г. д. [42, с. 73–74].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Статуты існаваўшых у XVI – XVII стст. на тэрыторыі Беларусі брацкіх школ рэгламентавалі паводзіны настаўнікаў на ўроку, у школе і за яе межамі. Настаўнік выбіраўся на агульных сходах брацтваў, пры гэтым ён быў абавязаны яшчэ да выбрання выкласці свае педагагічныя погляды [30, с. 66]. Настаўнік павінен быў не толькі «быть благочестив, рассудителен, смиренномудр, кроток, воздержлив, не пьяница, не блудник, не лихомерец, не гневлив, не завистлив, не смехотворец, не сквернослов, не чародей, не басносказатель, не пособник ересей, не поспешник благочестия, во всём представляя собою образец благих дел» [30, с. 147], але «и учить и любить детей всех одинаково…, учить их, сколько кто по силам научиться может…» [30, с. 148].

Прыкладам спробы фарміравання прафесійнага майстэрства настаўніка на практыцы можа з'яўляцца педагагічны працэс Слуцкай школы. Статут, выдадзены ў 1628 г., – старэйшае выданне такога роду на Беларусі, з'яўляецца арыгінальнай спробай арганізацыі педагагічнай сістэмы. Арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу асноўвалася ў першую чаргу на дакладным адборы педагагічнага персаналу школы праз прад'яўляемыя да іх прафесійнай дзейнасці патрабаванні. Ва ўставе гаварылася, што школа з'яўляецца «мастерской человеческих душ» [3, с. 100] і таму працаваць могуць з вучнямі толькі адукаваныя, шчырыя настаўнікі, якія могуць і хочуць навучаць умела, пранікліва і метадычна. Настаўнік павінен быў прыкладаць усе намаганні і сілы для навучання школьнікаў усяму таму, што належыць вывучыць. Умела перадаючы вучням веды, ён мусіў карыстацца вучэбным дапаможнікам і асноўвацца на правілах і добрых прыкладах [3, с. 100].

У выкладчыцкай практыцы віталася ўменне настаўніка з дапамогай прыкладаў заваёўваць душы маладых людзей, якіх патрэбна весці да навукі. Лісліваcцю і хітрасцю нельга дасягнуць станоўчага выніку ў навучанні [3, с. 100]. Упершыню ўпаміналася неабходнасць валодання настаўнікам методыкай выкладання школьнага прадмета як умовай фарміравання яго прафесійнага майстэрства і паспяховай арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Наступленнем эпохі Асветніцтва прынята лічыць XVIII ст. Цэнтрам навукі і культуры становіцца Віленская акадэмія, якая з 1773 г. з'яўлялася Галоўнай школай Вялікага Княства Літоўскага, а ў 1803 г. была рэарганізавана ў Віленскі універсітэт [3, с.17].

Віленскі універсітэт стаў цэнтрам асветы ў Заходнім краі, па многіх пытаннях займаў перадавыя пазіцыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Але тут, на жаль, не было выпрацавана адзінага падыходу да педагогікі і да педагагічных навук. Філолаг Гордэк, напрыклад, прызнаваў неабходнасць выкладання педагагічных навук будучым настаўнікам, а рэктар універсітэта **Ян**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Снядзецкі (29.08.1756 – 21.11(21.09).1830 г.)** быў супраць і меркаваў, што адзінага падыходу ў гэтым пытанні не павінна быць, так як кожны вучоны па-свойму вучыць, як выкладаць яго прадмет [3, с. 19]. Тым самым ён адмаўляў магчымасць фарміравання прафесіяналізму настаўніка.

Папячыцель Беларускай вучэбнай акругі (Віленская вучэбная акруга была ліквідавана ў сувязі з падзеямі 1830 – 31 гг., адноўлена ў 1850 г.) **Рыгорам Іванавічам Карташэўскім (1777 – 1840 г.)** была распачата справа ў галіне падрыхтоўкі настаўніка. У 1834 г. па яго ініцыятыве ў Віцебску была створана першая ў гісторыі Беларусі семінарыя для падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых школ, падрыхтоўчых класаў гімназій і павятовых вычылішч. Галоўным крытэрыям адбору абітурыентаў для іх далейшага навучання ў Маскоўскім і Пецярбургскім універсітэтах ён лічыў наяўнасць здольнасцей да педагагічнай дзейнасці і да далейшага навучання [3, с. 177]. Шляхі ўдасканалення прафесійнай дзейнасці настаўніка ён бачыў у веданні ім методыкі выкладаемага прадмета, уменні паспяхова іх рэалізоўваць на ўроках і ў абмене настаўнікамі метадычным вопытам. Абавязковым момантам у настаўніцкай справе ён лічыў валоданне ведамі аб псіхалогіі дзяцей і асаблівасцях іх узроставага развіцця: «…старайтесь более читать им занимательные, лёгкие и удобовразумительные по их возрасту статьи… » [3, с. 177].

Прыкметным прадстаўніком педагагічнай думкі Беларусі апошняй чвэрці XVIII – першай паловы XIX ст. быў **Казімір Нарбут (03.01.1738 – 17.03.1807 г.)**. У творы «Логика, или Наука о размышлении и рассуждении, благодаря которой всякий сможет во всём достигать истины и остерегаться заблуждений», у напісаных ім раздзелах для школьнага кодэкса «Устав парафиальных школ» і «Об инспектировании (визитации) школ» ён выразіў свае асветніцкія ідэі. Шматлікія невырашальныя беды і праблемы ўзнікаюць, на яго думку, па прычыне недасканаласці настаўнікаў, якія часам самі не ведаюць таго, чаму хочуць навучыць, ці не валодаюць метадамі навучання ведам. Недахопам некаторых настаўнікаў ён лічыў няўменне адбіраць карысныя веды і навучаць дзяцей толькі патрэбным рэчам, якія ім змогуць спатрэбіцца пазней. Згодна з яго прадстаўленнямі, настаўнікі выхоўваюць вучняў падобнымі да сябе. Таму настаўнік не павінен быць ганарыстым, славалюбным, развязным у гаворцы, занадта строгім ці наогул «плохих нравов» ва ўсіх адносінах. Ён лічыў, што неабходны такія настаўнікі, якія маюць прыроджаныя здольнасці да настаўніцкай працы, валодаюць жаданнем, воляй, стараннасцю і прыстойнасцю, падрыхтаваны да выкладання прадмета папярэднімі навукамі [3, с. 147]. З большай ахвотай і дакладней, на думку асветніка, выконваць свае прафесійныя абавязкі будзе той, хто сам абучаны гэтай справе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Значную ўвагу ён надаваў асобе педагога, акцэнтуючы гуманныя адносіны настаўнікаў з вучнямі, павагу асабістай годнасці дзяцей: «Учитель не должен обзывать их оскорбительными словами, подвергать телесным наказаниям… должен узнавать о их болезнях и других огорчениях и требовать помощи им со стороны владетелей или арендаторов имений» [13, с. 34].

На думку Казіміра Нарбута, майстэрства настаўніка складаецца з наступных кампанентаў:

- змястоўная навуковая падрыхтоўка;
- веданне методыкі і метадаў выкладання прадмета навучання;
- наяўнасць здольнасці і жадання выконваць сваю працу выкладчыка;
- валоданне бездакорнымі асабовымі характарыстыкамі.

На стыку XIX – XX стст. у айчыннай педагагічнай думцы склаліся выразныя прадстаўленні аб прафесійным майстэрстве настаўніка. Але само паняцце «прафесійнае майстэрства» не было яшчэ сфармулявана, паколькі ў абазначаны перыяд размова ішла хутчэй аб патрабаваннях, прад’яўляемых да маральных і духоўных якасцей настаўніка, да яго ведаў і ўменняў, здольнасцей наладзіць кантакт з вучнямі, стварыць станоўчую атмасферу вучэбнай дзейнасці на ўроку. Прафесійнае майстэрства педагога разглядалася ў абазначаны перыяд у ракурсе праблемы падрыхтоўкі настаўніка і непасрэднага ажыццяўлення ім прафесійнай практычнай дзейнасці.

У пачатку XX ст. ужо склаліся даволі выразныя ўяўленні аб прафесійным майстэрстве. Іх можна разглядаць і як крытэрыі, і як патрабаванні, прад’яўляемыя да прафесійнага майстэрства настаўніка:

- наяўнасць змястоўнай педагагічнай адукацыі;
- схільнасць і прызванне да педагагічнай дзейнасці;
- патрэбнасць у самаадукацыі, самаўдасканаленні і самаразвіцці;
- развіццё маральных і духоўных бакоў сваёй асобы.

Прасачыўшы эвалюцыю паняцця «майстэрства педагога», можна сцвярджаць, што на стыку XIX – XX стст. у айчыннай педагагічнай думцы назапасіўся значны вопыт для далейшай распрацоўкі гэтай праблемы, выяўлення крытэрыяў і ўзроўняў прафесійнага майстэрства, шляхоў і спосабаў яго фарміравання, развіцця і ўдасканалення. Неабходнасць прымянення навуковага падыходу да вывучэння гэтай праблемы, да выяўлення крытэрыяў прафесійнага майстэрства, яго ўзроўняў і спосабаў была абумоўлена таксама і ўзросшай патрэбай грамадства ў высокакваліфікаваных педагогах-спецыялістах. Гэта прывяло ў пачатку XX ст. да выдзялення паняцця «педагагічнае майстэрства» [46, с. 3] як асобнай важнай педагагічнай праблемы ў беларускай навуцы, якая патрабавала сваёй далейшай распрацоўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Праверым свае веды

**1. У якім стагоддзі адбылося першае ўпамінанне тэрміна «майстар», а дзейнасць настаўніка азначалася як «майстэрства»?**

а) у сярэдзіне XII ст.;
б) у сярэдзіне XIII ст.;
в) у сярэдзіне XIVст.

**2. Калі, паводле гісторыкаў Н. А. Канстанцінава і В. Я. Струмінскага, з'яўляецца прафесія настаўніка, якога называлі «майстрам граматы»?**

а) у сярэдзіне IX ст.;
б) у сярэдзіне X ст.;
в) у сярэдзіне XI ст.

**3. У чым праяўляўся прафесіяналізм «майстра граматы» ў эпоху сярэдневяковага феадалізму?**

а) ва ўменні навучаць дзяцей у духу багаслоўя;
б) ва ўменні навучаць дзяцей у патрыятычным духу;
в) ва ўменні навучаць дзяцей у ваенным духу.

**4. Назавіце галоўнае патрабаванне Францыска Скарыны да дзейнасці настаўніка.**

а) веданне методыкі выкладання прадметаў;
б) выкладанне на роднай мове;
в) выкарыстоўванне замежнага вопыту навучання дзяцей.

**5. Якую якасць лічыў Францыск Скарына асноўнай ў дасягненні майстэрства?**

а) самаўдасканаленне і імкненне да асветы;
б) ахова і прапаганда існуючага ладу жыцця;
в) імкненне да матэрыяльнага дастатку.

**6. Якую якасць Сымон Будны прызнаваў галоўнай якасцю настаўніка?**

а) веданне радаслоўнай кожнага свайго вучня;
б) веданне індывідуальных асаблівасцей сваіх вучняў;
в) веданне роднай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**7. Якія з пералічаных базавых каштоўнасцей перыяду гуманізму паслужылі ў якасці асновы для далейшай распрацоўкі патрабаванняў, прад'яўляемых да майстэрскай дзейнасці настаўніка?**

а) наяўнасць унутранай патрэбы ўсебаковага самаўдасканалення;

б) прызнанне свайго назначэння ў служэнні людзям і ў распаўсюджванні перадвввых ідэй свайго часу;

в) пакорнасць існуючаму ладу і безадказнае служэнне яму.

**8. На чым засноўваліся патрабаванні да дзейнасці настаўнікаў езуіцкіх школ на тэрыторыі Беларусі ў перыяд контррэфармацыі?**

а) на аўтарытэце настаўніка;

б) на атрыманай настаўнікам вышэйшай педагагічнай адукацыі;

в) на ўменні настаўніка падпарадкоўваць сабе вучняў.

**9. Пералічыце тыя ўменні, якімі павінен быў валодаць настаўнік езуіцкай школы.**

а) быць добрым прамоўцам;

б) уплываць на фарміраванне светапогляду выхаванцаў;

в) быць палітычна адукаваным.

**10. Хто першы з пералічаных педагогаў-асветнікаў Беларусі звярнуў увагу на існаванне праблемы ролі настаўніка і яго месца ў школе?**

а) Францыск Скарына;

б) Сымон Будны;

в) Сімяон Полацкі.

**11. Якімі якасцямі, на думку Сімяона Полацкага, павінен валодаць сапраўдны настаўнік?**

а) настаўнік павінен умець забараняць, кіраваць і загадваць на ўроку;

б) настаўнік павінен валодаць дастатковымі ведамі, адмыслова выкладаць свой прадмет і сэрцам любіць працу і вучняў;

в) настаўнік павінен дасканала ведаць Біблію.

**12. Ад настаўнікаў якіх школ патрабавалася «и учить и любить детей всех одинаково…, учить их, сколько кто по силам научиться может…» ?**

а) ад вандруючых настаўнікаў;

б) ад настаўнікаў езуіцкіх школ;

в) ад настаўнікаў брацкіх школ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**13. На чым засноўвалася арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу Слуцкай школы (XVI – XVII стст.)?**

а) на выбарах дырэктара школы, які валодаў якасцямі кіраўніка;

б) на прыёме ў школу дзяцей, вытрымаўшых прыёмныя іспыты;

в) на дакладным адборы педагагічнага калектыву школы праз прад'яўляемыя да іх прафесійнай дзейнасці патрабаванні.

**14. Якая ўмова дасягнення прафесійнага майстэрства настаўнікам упершыню ўпамінаецца ў Статуце Слуцкай школы?**

а) неабходнасць валодання настаўнікам методыкай выкладання школьнага прадмета;

б) неабходнасць папярэдняга практычнага вопыту ў якасці памочніка настаўніка;

в) наяўнасць вышэйшай педагагічнай адукацыі.

**15. Хто з пералічаных ніжэй вучоных-педагогаў Беларусі адмаўляў магчымасць фарміравання прафесіяналізму настаўніка?**

а) філолаг Гордэк;

б) Ян Снядзецкі;

в) Рыгор Іванавіч Карташэўскі.

**16. Што, паводле Рыгора Іванавіча Карташэўскага, з'яўляецца абавязковым момантам у справе ўдасканалення настаўніцкай справы?**

а) веданне методыкі выкладаемага прадмета;

б) абмен паміж настаўнікамі метадычным вопытам;

в) валоданне ведамі аб псіхалогіі дзяцей і асаблівасцях іх узроставага развіцця.

**17. Які з пералічаных кампанентаў, на думку Казіміра Нарбута, не ўваходзіў у педагагічнае майстэрства?**

а) наяўнасць здольнасці і жадання выконваць працу настаўніка;

б) веданне методыкі і метадаў выкладання прадмета навучання;

в) уменне загадваць, забараняць і кіраваць дзецьмі.

**18. Якое з пералічаных сцвярджэнняў з'яўляецца, на Вашу думку, правільным?**

а) да пачатку XX ст. у педагагічнай думцы Беларусі было сфармулявана паняцце «педагагічнае майстэрства», выяўляны шляхі яго фарміравання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

б) да пачатку XX ст. у айчыннай педагагічнай думцы склаліся выразныя ўяўленні аб прафесійным майстэрстве настаўніка, само паняцце «педагагічнае майстэрства» не было, аднак, яшчэ сфармулявана;

в) да пачатку XX ст. у педагагічнай думцы Беларусі вучоныя-педагогі не закранalі праблемы «педагагічнага майстэрства».

**19. Якое з пералічаных патрабаванняў да дзейнасці настаўніка лічылася асноўным пры распрацоўцы праблемы прафесійнага майстэрства да пачатку XX ст.?**

а) самаадукацыя, самаўдасканаленне і самаразвіццё настаўніка;

б) змястоўная педагагічная адукацыя;

в) схільнасць і прызванне да педагагічнай дзейнасці.

**20. Якім фактарам была абумоўлена неабходнасць прымянення навуковага падыходу да вывучэння праблемы «прафесійнае майстэрства настаўніка», выяўлення яго крытэрыяў, узроўняў і спосабаў яго фарміравання ў пачатку XX ст.?**

а) узросшай патрэбай грамадства ў высокакваліфікаваных педагогах-спецыялістах;

б) неабходнасцю вывучэння новых падыходаў да праблемы «прафесійнае майстэрства настаўніка» і перагляду сутнасці паняцця;

в) неабходнасцю распрацоўкі новых шляхоў фарміравання прафесійнага майстэрства настаўніка, непрыгоднасцю старых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## II. Праблема падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў Беларусі ў пачатку ХХ ст.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у эканоміцы, прамысловасці і сацыяльнай сферы Беларусі, уступіўшай на шлях капіталістычных адносін, адбывалася інтэнсіўнае развіццё, якое закранула і сферу адукацыі. У сярэдзіне XIX ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 12 сярэдніх і 45 няпоўных сярэдніх школ [20, с. 176]. Рост сярэдняй адукацыі ў апошняй чвэрці XIX ст. адзначаўся крайне маруднымі тэмпамі развіцця: у 1868 г. было 18 сярэдніх навучальных устаноў, а ў 1899 г. – 20 [17, с. 155].

Пачатак мінулага стагоддзя вызначаўся адносна марудным тэмпам росту сеткі сярэдніх навучальных устаноў. Так, у пачатку 1905 г. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 23 сярэднія ўрадавыя вучэбныя ўстановы (8 мужчынскіх і 10 жаночых гімназій, 1 мужчынская прагімназія, 3 рэальныя і 1 камерцыйнае вучылішча). У сетку прыватных вучэбных устаноў уваходзілі 2 вучэбныя ўстановы I разраду, 12 – II разраду і 65 падрыхтоўчых вучылішч III разраду. У 1914 г. налічвалася ўжо 13 мужчынскіх і 17 жаночых урадавых гімназій, 7 рэальных вучылішчаў, 16 мужчынскіх і 23 жаночыя прыватныя школы I разраду, 5 мужчынскіх і 40 жаночых – II разраду [48, с. 17 –18].

Такі невялікі рост сеткі сярэдніх навучальных устаноў сведчыў аб узрастаючай ролі ведаў сярод насельніцтва. На фоне эвалюцыі сеткі сярэдніх навучальных устаноў адзначалася вострая супярэчнасць існуючай сістэмы адукацыі з патрабаваннямі жыцця, так як адсталасць школьнай адукацыі станавілася тормазам на шляху эканамічнага развіцця [60, с. 80]. Класічная гімназія, застаючыся асноўным тыпам сярэдняй школы, даказала ў многіх адносінах сваю негрунтоўнасць. Яе ўнутраны распарадак, які быў пабудаваны па вобразе і падабенстве паліцэйскай дзяржавы, пачынаў выклікаць масавыя пратэсты вучняў і грамадскасці. Адукацыйная палітыка царскага ўрада на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. была супярэчлівай. З аднаго боку, далейшае абвастрэнне сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сітуацыі, пад’ём грамадска-педагагічнага руху патрабавалі стварэння сеткі народных школ і педагагічных вучэбных устаноў, прызваных рыхтаваць кадры для іх. З другога боку, жаданне ўтрымаць народныя масы ў не́вуцтве, у рамках прыхільнасці існуючаму ладу вымушала ўрад стрымліваць развіццё агульнай і спецыяльнай адукацыі [29, с. 45]. Урад у пошуках шляхоў выхаду з дадзенай сітуацыі звяртаўся нават да рэпрэсій у адносінах да вучнёўскай моладзі і абяцаў правядзенне рэформ [35, с. 22]. Узнікла вострая неабходнасць рэфармавання сістэмы сярэдняй адукацыі. Бюракратычны характар школы, класіцызм і разрыў паміж сярэдняй і вышэйшай ступенямі адукацыі адзначаліся як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асноўныя недахопы сярэдняй школы на рубяжы стагоддзяў [28, с. 66]. Незадаволенасць пастаноўкай вучэбнай справы ў сярэдняй школе была выклікана таксама панаваўшым духам падаўлення асобы дзіцяці, прымяненнем насілля і працвітаннем фармалізму.

Неабходнасць рэфармавання сістэмы школьнай адукацыі з’явілася перадумовай перагляду стану падрыхтоўкі гімназічных педагогаў. Пагэтаму незвычайную актуальнасць набыла праблема распрацоўкі асноў тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі настаўніка сярэдняй школы. Вострая неабходнасць рэфармавання школы і перагляду змястоўна-арганізацыйных форм падрыхтоўкі педагагічных кадраў, як адзначаецца сучаснымі даследчыкамі, абумоўлівалася і тым, што настаўніцтва з’яўлялася адной з састаўных сацыяльна-палітычнай барацьбы супраць царскага самаўладдзя за перабудову ўсяго грамадскага жыцця.

Першае дзесяцігоддзе XX ст. адзначалася адсутнасцю паслядоўнай адукацыйнай палітыкі. Галоўную ідэю адукацыі Мікалай II бачыў у выхаванні дабрадзейных праваслаўных людзей, якія захоўвалі б трон [11, с. 18]. Змяняўшыя адзін аднаго ў гэты перыяд міністры адукацыі (Н. П. Багалепаў, П. С. Ваноўскі, Г. Э. Зенгер, В. Г. Глазаў, І. І. Талсты, П. М. Кауфман, А. Н. Шварц, Л. А. Кассо) разумелі неабходнасць рэформ. Неналаджаны, аднак, дыялог з імператарам дазваляў ім здзяйсняць толькі павярхоўныя змены, якія тычыліся ў асноўным змяншэння выкладання старажытных моў у гімназіях. Гэтыя змены з’яўляліся па сваёй сутнасці толькі крокам прыстасавання да патрэб капіталістычнага развіцця [35, с. 18–20].

Даволі значныя меры ў справе падрыхтоўкі настаўнікаў былі распачаты міністрам Н. П. Багалепавым, які адзін з першых на рубяжы стагоддзяў засяродзіў сваю ўвагу на паляпшэнні пастаноўкі вучэбнай справы ўжо існуючых сярэдніх навучальных устаноў. Важным па сваім значэнні бачыцца яго цыркулярная прапанова ад 16 лістапада 1898 г. аб педагагічнай падрыхтоўцы і матэрыяльным забеспячэнні настаўнікаў сярэдніх школ. Гэтым пытанням міністр надаваў першарадную важнасць, мяркуючы, што ўсякая школа «прежде всего и больше всего держится хорошим учителем, избавленным от забот о своих насущных нуждах» [25, с. 33]. Прычынай гэтаму паслужыла таксама адсутнасць спецыяльнай педагагічнай падрыхтоўкі ў пачынаючых педагогаў, што пазбаўляла школьнае кіраўніцтва магчымасці своечасова высвятляць, хто з кандыдатаў на выкладчыцкія пасады не валодае дастатковымі здольнасцямі да выкладання, замаруджвала вывучэнне курса вучэбных устаноў, аслабляла ўплыў школы на вучняў, выклікаючы справядлівую незадаволенасць іх бацькоў [25, с. 34].

Наступным крокам у справе падрыхтоўкі настаўнікаў было заснаванне ў студзені 1900 г. асобай камісіі з мэтай паляпшэння вучэбна-выхаваўчай справы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў сярэдняй школе [25, с. 35]. Стварэнню гэтай камісіі папярэднічаў зварот летам 1899 г. Н. П. Багалепава з цыркулярнай прапановай да папячыцеляў вучэбных акруг аб выбранні ў яе склад вопытных і адукаваных кіраўнікоў і выкладчыкаў сярэдніх навучальнах школ, выразнікаў патрэб гімназій і рэальных вучылішч для забеспячэння паспяховасці працы камісіі [25, с. 35–36]. Вынікі яе працы, выкладзеныя ў васьмі тамах (журналы агульных пасяджэнняў, даклады особных членаў, дадаткі да гэтых журналаў, працы падкамісій і г. д.), падлягалі далейшай апрацоўцы і патрабавалі выбару пэўнага накірунку ў пытанні аб рэформе сярэдняй адукацыі і аб падрыхтоўцы выкладчыкаў сярэдняй школы.

Цыркуляр міністэрства народнай асветы ад 1 жніўня 1900 г. даў выкладчыкам магчымасць пры складанні праграм па прадметах рабіць скарачэнні ў адных аддзелах і расшыраць другія, кіраўніцтва выхаваўчай часткай стала абавязкам педагагічных саветаў [25, с. 40–41].

Другое дзесяцігоддзе мінулага стагоддзя аказалася пераломным не толькі для краіны, але і для адукацыі ў цэлым. Стабільнасць адукацыйнай палітыкі, якая працягвалася да 1914 г., змянілася часам рэфармавання адукацыі (1915 – 1916 гг.). Міністр народнай адукацыі граф П. Н. Ігнацьеў паклаў у аснову сваіх рэформ дакладныя мэты, выдзеліў прыярытэты адукацыі. Яго педагагічныя ідэі напоўнілі пазней дзейнасць Часовага ўрада. Адукацыйная палітыка Часовага ўрада, аднак, не вызначалася цэласнасцю і сістэмнасцю, паколькі за дзевяць месяцаў там змяніліся чатыры міністры (П. Н. Ігнацьеў, М. К. Кульчыцкі, С. С. Салазкін, С. Ф. Альдэнбург). У 1918 – 1919 гг. ў цэлым дамінавала разбурэнне старой сістэмы, якое садзейнічала і разбурэнню школы [11, с. 23]. Дзейнасць Міністраў Народнай Адукацыі ў галіне рэфармавання сярэдняй школы не мела станоўчага выніку ў справе падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдняй школы для Віленскай вучэбнай акругі.

Актуальнасць і неабходнасць тэарэтычнай распрацоўкі праблемы прафесійнага майстэрства настаўніка ў тэорыі і практыцы падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдняй школы на тэрыторыі Беларусі была выклікана ў першую чаргу адсутнасцю вышэйшых навучальных устаноў, рыхтаваўшых настаўнікаў гарадскіх вучылішч і сярэдніх школ. Існаваўшыя ў 1905–1916 гг. настаўніцкія семінарыі (Маладзечна, Полацк, Нясвіж, Свіслач, Рагачоў, Орша, Барысаў, Гомель, Бабруйск) рыхтавалі настаўнікаў пачатковай школы. Адкрытыя ў гэтыя гады настаўніцкія інстытуты (Віцебск, Магілёў, Мінск) не з’яўляліся вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і рыхтавалі настаўнікаў для пачатковых школ павышанага тыпу. Толькі Мінскі настаўніцкі інстытут атрымаў права рыхтаваць разам з настаўнікамі вышэйшых пачатковых вучылішч настаўнікаў гімназіі [14, с. 64]. Беларускія настаўнікі атрымлівалі вышэйшую педагагічную адукацыю ў Маскве, Пецярбургу, Кіеве і іншых універсітэцкіх гарадах Расіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[48, с. 19]. З 1914 г. ва ўмовах дэфецыту адпаведнай падрыхтоўкі педагагічных кадраў арганізоўваюцца дзяржаўныя і прыватныя педагагічныя курсы [14, с. 65]. «Выпадковыя», пасрэдныя настаўнікі, якія сустракаліся ў гімназічных установах, – вынік пастаянна адчуваемага гімназіямі дэфецыту педагагічных кадраў, недасканаласці арганізацыі педагагічнай адукацыі настаўнікаў у Беларусі [14, с. 74]. Значная колькасць выкладчыкаў працавала ў сярэдніх школах Беларусі, не маючы спецыяльнай вышэйшай адукацыі. На актуальнае ў той час для Беларусі пытанне аб адкрыцці вышэйшай навучальнай установы міністр народнай адукацыі Л. А. Кассо ў 1913 г. заявіў, што гэта справа не патрабуе спешнага прыняцця рашэння і што час вырашэння гэтага пытання прыйдзе не так хутка [12, с. 528–529].

Кіруючыся вышэйназваным сцвярджэннем міністра народнай адукацыі Н. П. Багалепава аб тым, што добрая школа трымаецца на добрых настаўніках, гімназічнае кіраўніцтва надавала найбольшую ўвагу фарміраванню практычнага майстэрства педагогаў. Пры гэтым фарміраванне прафесійнай падрыхтоўкі не разглядалася як адзіная ўмова высокай якасці настаўніцкай працы [14, с. 66]. Паняцці ўдасканалення педагагічнага майстэрства, педагагічная перападрыхтоўка і павышэнне педагагічнай кваліфікацыі, па сцвярджэнню некаторых даследчыкаў, у гэты час атаясамліваюцца. Залогам паспяховай і плённай дзейнасці прызнаваліся прадстаўленне настаўніку прастору для творчасці, права на «самадзейнасць», асабістыя якасці настаўніка і ўзровень яго культуры, разнастайнасць інтарэсаў, удзел у навукова-даследчыцкай дзейнасці і грамадскім жыцці губерні [14, с. 66–69]. Важным сродкам «привлечения к преподавательскому званию достойных и способных лиц» з'яўлялася стварэнне ўмоў для паўнацэнной працы і ўдасканаленне яе арганізацыі, забеспячэнне належнага матэрыяльнага становішча [12, с. 73].

Такім чынам, надзвычайна актуальная праблема рэфармавання сярэдняй адукацыі ў пачатку XX ст. у Беларусі была абумоўлена ў першую чаргу развіццём прамысловасці і капіталізму, а таксама павялічыўшымся попытам насельніцтва на сярэднюю адукацыю. Рэфармаванне сістэмы сярэдняй адукацыі, аднак, не магло не пацягнуць за сабой і неабходнасць распрацоўкі важнай праблемы для паспяховага ажыццяўлення вучэбнай справы – распрацоўкі асноў тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі настаўнікаў і ўдасканалення іх прафесійнага майстэрства. Зварот да дадзенай праблемы быў абумоўлены наступнымі фактарамі:

- ростам сеткі сярэдніх навучальных устаноў;
- адсутнасцю на тэрыторыі Беларусі ў пачатку мінулага стагоддзя вышэйшай навучальнай педагагічнай установы;
- прад'яўленнем грамадствам павышаных патрабаванняў да сярэдняй адукацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- павышэннем патрабаванняў да прафесійных і асабістых якасцей настаўніка гімназіі;
- імкненнем саміх настаўнікаў прафесійна выконваць свае педагагічныя функцыі ў адпаведнасці з сацыяльнымі патрабаваннямі і заказамі індустрыяльнага грамадства.

У разглядаемы перыяд паняцці «педагагічнае майстэрства» і «педагагічная кваліфікацыя» атаясамліваліся, не праводзілася выразнага размежавання паміж патрабаваннямі ў набыцці педагагічнай кваліфікацыі праз асваенне дадатковых праграм і патрабаваннямі ў росце і ўдасканаленні педагагічнага майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Праверым свае веды

**1. Колькі сярэдніх школ дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.?**

а) 2 сярэднія і 4 няпоўныя сярэднія школы;
б) 12 сярэдніх і 45 няпоўных сярэдніх школ;
в) 22 сярэднія і 54 няпоўныя сярэднія школы.

**2. Колькі сярэдніх навучальных установаў налічвалася на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX ст.?**

а) 10 сярэдніх навучальных установаў;
б) 15 сярэдніх навучальных установаў;
в) 20 сярэдніх навучальных установаў.

**3. Аб чым сведчыў невялікі рост сярэдніх навучальных установаў у пачатку XX ст.?**

а) аб узрастаючай ролі ведаў сярод насельніцтва;
б) аб павелічэнні колькасці насельніцтва;
в) аб паляпшэнні матэрыяльнага забеспячэння сярэдніх навучальных установаў.

**4. Назавіце асноўны тып сярэдняй школы на Беларусі ў пачатку XX ст.**

а) рэальнае вучылішча;
б) класічная гімназія;
в) прагімназія.

**5. Назавіце асноўны недахоп сярэдняй школы Беларусі на стыку XIX і XX стст.**

а) бюракратычны характар і разрыў паміж сярэдняй і вышэйшай ступенямі адукацыі;
б) немагчымасць вывучэння старажытных моў;
в) адсутнасць у школах пасад класных кіраўнікоў і магчымасці ў вучняў наведваць царкву.

**6. Што з'явілася перадумовай перагляду стану справы па падрыхтоўцы гімназічных педагогаў?**

а) неабходнасць рэфармавання сістэмы школьнай адукацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

б) патрабаванні навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў аб паляпшэнні выкладання школьных прадметаў;

в) палітычная сітуацыя ў краіне.

**7. Назавіце міністра адукацыі, які здзейсніў даволі значныя меры ў справе падрыхтоўкі настаўнікаў і засяродзіў сваю ўвагу на паляпшэнні пастаноўкі вучэбнай справы ўжо існуючых навучальных устаноў.**

а) Н. П. Багалепаў;

б) П. С. Ваноўскі;

в) Г. Э. Зенгер.

**8. Якому з пералічаных ніжэй міністраў адукацыі належаць словы аб тым, што школа «прежде всего и больше всего держится хорошим учителем, избавленным от забот о своих насущных нуждах»?**

а) В. Г. Глазаву;

б) І. І. Талстому;

в) Н. П. Багалепаву.

**9. З якой мэтай міністрам адукацыі Н. П. Багалепавым у студзені 1900 г. была заснавана асобая камісія?**

а) з мэтай кантролю за выкладаннем новых моў у гімназіях;

б) з мэтай паляпшэння вучэбна-выхаваўчай справы ў сярэдняй школе;

в) з мэтай высвятлення колькасці настаўнікаў і вучняў сярэдніх школ.

**10. Што дазвалялася рабіць настаўнікам згодна з цыркулярам Міністэрства народнай асветы ад 1 жніўня 1900 г.?**

а) дазволены выбар вучняў пры наборы іх у свае класы;

б) было дазволена не выкладаць прадметы, якія не падабаюцца вучням;

в) рабіць скарачэнні або пашыраць асобныя аддзелы пры складанні праграм.

**11. Назавіце перыяд адноснай стабільнасці ў развіцці адукацыі ў Беларусі.**

а) пачатак XX ст. – 1914 г.;

б) 1915 – 1916 гг.;

в) 1918 – 1919 гг.

**12. Назавіце асноўную прычыну распрацоўкі праблемы педагагічнага майстэрства ў Беларусі ў першай трэці XX ст.**

а) адсутнасць вышэйшых навучальных педагагічных устаноў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рыхтаваўшых настаўнікаў гарадскіх вучылішч і сярэдніх вучэбных устаноў;

б) наяўнасць шырокай сеткі сярэдніх навучальных устаноў;

в) патрабаванне міністэрства народнай адукацыі аб пераглядзе тэарэтычных падыходаў да праблемы педагагічнага майстэрства настаўніка.

**13. Які з пералічаных настаўніцкіх інстытутаў атрымаў права падрыхтоўкі разам з настаўнікамі вышэйшых пачатковых вучылішч настаўнікаў гімназіі ў пачатку XX ст.?**

а) Віцебскі настаўніцкі інстытут;

б) Магілёўскі настаўніцкі інстытут;

в) Мінскі настаўніцкі інстытут.

**14. З якога года пачынаюць арганізоўвацца дзяржаўныя і прыватныя педагагічныя курсы?**

а) з 1906 г.;

б) з 1910 г.;

в) з 1914 г.

**15. З якой мэтай арганізоўваліся дзяржаўныя і прыватныя педагагічныя курсы?**

а) з мэтай павышэння прафесійнага майстэрства настаўнікаў;

б) з мэтай падрыхтоўкі педагагічных кадраў для сярэдніх навучальных устаноў;

в) з мэтай ліквідацыі палітычнай няграматнасці сярод настаўнікаў.

**16. На што была скіравана найбольшая ўвага гімназічнага кіраўніцтва ў справе паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы?**

а) на фарміраванне практычнага майстэрства педагогаў;

б) на паляпшэнне матэрыяльнай базы навучальный установы;

в) на змяншэнне вучэбнай нагрузкі школьнікаў і павялічэнне ролі фізічнага выхавання.

**17. Што лічылася важным сродкам «привлечения к преподавательскому званию достойных и способных лиц» у гімназічнага кіраўніцтва ў разглядаемы перыяд?**

а) стварэнне добрых умоў працы і забеспячэнне належнага матэрыяльнага становішча настаўніка;

б) надзяленне настаўніка шырокімі правамі ў адносінах да навучэнцаў;

в) прадастаўленне настаўніку права самастойна рабіць набор вучняў у клас, у якім збіраўся выкладаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**18. Неабходнасць распрацоўкі якой праблемы пацягнула за сабой рэфармаванне сістэмы сярэдняй адукацыі?**

а) неабходнасць распрацоўкі праблемы прыстасавання гімназічнага кіраўніцтва да новых умоў;

б) неабходнасць распрацоўкі асноў тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі настаўнікаў і ўдасканалення іх прафесійнага майстэрства;

в) неабходнасць састаўлення новых праграм выкладання школьных прадметаў згодна з інтарэсамі вучняў.

**19. Вызначце фактары, якія абумовілі зварот да праблемы распрацоўкі асноў тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі настаўнікаў і ўдасканалення іх прафесійнага майстэрства.**

а) прад'яўленне грамадствам павышаных патрабаванняў да сярэдняй адукацыі;

б) павышэнне патрабаванняў да прафесійных і асабістых якасцей настаўніка гімназіі;

в) атрыманне настаўніцкімі інстытутамі права ажыццяўляць падрыхтоўку настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## III. Погляды на праблему прафесійнага майстэрства настаўніка ў працах тэарэтыкаў педагагічнай навукі Беларусі ў першай трэці XX ст.

Праблема майстэрства настаўніка і яго ўдасканаленне ў педагагічных поглядах **Адама Ягоравіча Багдановіча (20.03.1862 – 16.04.1940 г.)** знайшла станаўленне і развіццё на мяжы XIX – XX стст. Дасканалыя веды і практычны вопыт Адама Ягоравіча ў галіне разглядаемага пытання, па прызнанні яго самаго, дастаўся дзякуючы самаадукацыі, кнігам і настойлівай працы [6, с. 36].

Педагог строга адносіўся да настаўнікаў, прытрымліваючыся правіла: «каков учитель, такова и школа» [9, с. 2]. Ім неаднаразова падкрэслівалася, што поспехі вучняў залежаць ад выкладчыкаў, «от их степени подготовленности к своему делу, от их талантливости как педагогов, от умения преподавать» [10, с. 3]. Вывучаючы прычыны меўшых месца ў дарэвалюцыйнай гімназіі недахопаў (муштра, палачная дысцыпліна, антыпедагагічныя прыёмы навучання, перагрузка праграм), ён закранаў злабадзённае пытанне навуковай падрыхтоўкі настаўнікаў, паколькі амаль усе выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў не мелі педагагічнай адукацыі [3, с. 236]. Асветнік патрабаваў ад настаўнікаў шырокай эрудыцыі, ведаў з розных галін навук, надаваў вялікае значэнне аўтарытэту, асабістаму прыкладу, творчым адносінам да дзейнасці. Прафесійнага ўдасканалення зможа дасягнуць толькі той настаўнік, на думку асветніка, які, дзякуючы сваім паводзінам, адносінам да дзяцей і акружаючых людзей, сваім маральным якасцям, зможа заваяваць аўтарытэт. Навуковая падрыхтоўка, веданне дыдактыкі, глыбокае разуменне псіхалогіі дзяцей разглядаліся ім як асноўныя састаўныя часткі прафесійнага майстэрства. Навуковая падрыхтоўка, па яго меркаванні, павінна заключацца не толькі ў веданні выкладаемага ім прадмета, але і ў веданні іншых навук.

Ім тлумачылася таксама значэнне самаадукацыі ў пасціжэнні вяршыні настаўніцкай дзейнасці. Праяўленне ж майстэрства ён бачыў ва ўмелым выкананні асноўнай педагагічнай задачы – развіцці разумовых здольнасцей вучняў і іх мыслення, выхаванні імкнення самастойна набываць веды. Той настаўнік з’яўляецца майстрам, які займаецца самаадукацыяй, з’яўляючыся пры гэтым узорам для вучняў і развіваючы тым самым у іх імкненне да самастойнага набыцця ведаў [10, с. 3]. Аснову ўдасканалення прафесійнага настаўніцкага майстэрства ён бачыў у таленавітасці педагога, у ступені падрыхтаванасці яго да настаўніцкай справы, у яго уменні выкладаць, г. зн. наяўнасці метадычных ведаў.

Асобае месца ў сваіх поглядах на праблему майстэрства настаўніка ён адводзіў «рацыянальнаму выкладанню» [3, с. 237]. Сутнасць паняцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«рацыянальнае выкладанне» у разуменні Адама Ягоравіча Багдановіча заключаецца ў гарманічным развіцці ўсіх здольнасцей вучня. Адзначаючы, што настаўнікі часам патрабуюць толькі завучвання зададзенага на памяць, не звяртаюць увагі на ўсвядомленасць засваення ўрока, ён адзначаў, што пры такіх адносінах да справы ігнаруецца ўзровень развіцця вучня, адводзіцца месца толькі механічнаму запамінанню. Пры рацыянальным выкладанні, лічыў педагог, не можа і не павінна быць розніцы паміж вучнямі, не можа і не павінна быць непаспяваючых школьнікаў.

Такім чынам, абапіраючыся на педагагічныя ідэі Адама Ягоравіча Багдановіча, прафесійнае майстэрства педагога можна вызначыць як «рацыянальнае выкладанне», накіраванае на развіццё вучняў, выхаванне ў іх імкнення самастойна набываць веды. Ім вызначаюцца такія састаўныя часткі педагагічнага майстэрства, як:

- грунтоўная педагагічная адукацыя;
- веданне методыкі выкладаемага прадмета;
- самаадукацыя настаўніка як яго ўнутраная патрэбнасць;
- уплыў настаўніка на сваіх вучняў сваёй асобай;
- педагагічны талент;
- аўтарытэт;
- асабісты прыклад;
- творчыя адносіны да справы;
- шырокі кругагляд.

Дасягненне вяршыні педагагічнага майстэрства і яго павышэнне бачыліся яму шляхам набыцця педагагічнай адукацыі і самаадукацыі.

Педагог-метадыст **Канстанцін Васільевіч Яльніцкі (1840 – 1917 г.)** у пачатку мінулага стагоддзя таксама распрацоўваў праблему падрыхтоўкі настаўніка да выкладчыцкай дзейнасці і фарміравання яго прафесійнага майстэрства. Свае погляды ён асноўваў на асабістым практычным вопыце. Ім указваліся тыя дадатныя якасці, якімі павінен валодаць настаўнік-майстар, без якіх немагчыма «освещать жизненный путь других» [6, с. 485].

Асаба настаўніка, на думку педагога-метадыста, абумоўлівае поспех працэсу навучання [56, с. 14]. Развіццё ж значных для педагагічнай працы асабістых якасцей настаўніка – абавязковая ўмова фарміравання прафесійнага майстэрства.

Асветнікам выдзяляюцца таксама такія неабходныя якасці для авалодання настаўніцкім майстэрствам, як зацікаўленасць педагога ў выніку сваёй дзейнасці, любоў да сваіх вучняў. Ён звяртае ўвагу менавіта на разумную любоў да вучняў, якая дазваляе настаўніку не песціць іх, а кіравацца ў сваёй дзейнасці ведамі і педагагічным тактам, быць для вучняў прыкладам



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працавітасці, у пэўнай меры строгім, справядлівым, не патураць іх капрызам, а заўсёды праяўляць самавалоданне, ні ў якім разе не зневажаць іх гонар.

Неабходна таксама адзначыць, што педагог ядром працэсу навучання і выхавання лічыў родную мову як крыніцу духоўнасці і культуры народа. Бездакорнае валоданне роднай мовай садзейнічала павышэнню ўзроўню выкладчыцкай працы навучаючага і гуманізацыі педагагічнага працэсу ў цэлым [57, с. 17].

Майстэрства настаўніка ў педагагічных ідэях Канстанціна Васільевіча Яльніцкага трактуецца як адказ навучаючага ад шаблоннасці і трафарэтнасці ў арганізацыі і правядзенні ўрокаў, яго імкненне да творчага асэнсавання педагагічнага вопыту папярэдніх пакаленняў [56, с. 17].

На думку педагога, дасягненне настаўніцкага майстэрства немагчыма без:

- ❖ бездакорнага валодання роднай мовай навучаемых;
- ❖ зацікаўленасці настаўніка ў паспеху сваёй дзейнасці;
- ❖ любові настаўніка да вучняў;
- ❖ педагагічнага такту, працавітасці і самавалодання настаўніка;
- ❖ жывасці і эмацыянальнасці настаўніка пры правядзенні ўрокаў;
- ❖ дасціпнасці і вынаходлівасці настаўніка ў працэсе навучання.

Шляхі фарміравання майстэрства бачыліся асветніку ва ўмелым удасканаленні самім педагогам сваіх асабістых якасцей, якія адыгрываюць галоўную ролю ў паспяховым выкананні педагагічнай дзейнасці (валоданне мовай, манера весці гутарку і г. д.).

Педагог **Міхаіл Васільевіч Радзевіч (1838 – пасля 1917 г.)**, як і яго папярэднікі, меў грунтоўны педагагічны практычны вопыт: працаваў у мужчынскіх і жаночых гімназіях Віленскай вучэбнай акругі, у 1870 г. быў прызначаны інспектарам Віленскай дырэкцыі народных вучылішч [2, с. 339]. Атрыманы ў працэсе настаўніцкай дзейнасці вопыт, назіранні і ідэі асветнік абагульніў у пачатку XX ст. у шматлікіх педагагічных працах: «Купцы – реформаторы гимназий», «В народной школе», «Белорусские народные школы», «Несколько слов об учительских институтах», «Единица. (Из воспоминаний учителя)», «На уроках. (Из записок учителя)» і інш. [3, с. 212]. Асаблівую ўвагу ён звярнуў на першачарговую ролю ў выхаванні дзяцей паводзін настаўніка, яго уменне ўздзейнічаць на вучняў, умелае і тактычнае прымяненне ім метадаў пераканання і тлумачэння [6, с. 339]. Развітасць вучняў і добрае авалодванне ведамі педагог тлумачыў не толькі іх прыроднымі задаткамі, але і ставіў іх у залежнасць ад добрай падрыхтоўкі настаўнікаў [3, с. 213].

Дасягнуць пастаўленых мэт у навучанні і выхаванні, па яго меркаванні, можна толькі пры наяўнасці строга распрацаванага разумнага распарадку ў вучэбнай установе, які ён разглядаў як аснову паспяховай дзейнасці настаўніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і далейшага фарміравання яго майстэрства. Наступнай умовай ён выдзяляў узаемаадносіны педагогаў і выхаванцаў, дзейнасць і паводзіны самога настаўніка, яго матэрыяльную незалежнасць.

Такім чынам, педагагічнае майстэрства, на думку Міхаіла Васільевіча Радзевіча, праяўляецца ва ўмела наладжаных узаемаадносінах педагога і вучня, што дазваляе настаўніку дасягаць найлепшых вынікаў ў падачы ведаў сваім вучням. Майстэрства, па яго меркаванням, складаецца з:

- узаемаадносін педагогаў і выхаванцаў;
- паводзін педагога;
- тактычнага і ўмелага выкарыстання метадаў і прыёмаў навучання;
- добрай падрыхтоўкі ў галіне выкладаемага прадмета;
- пры штодзённай працы над удасканаленнем сваіх маральных асабістых якасцей і паводзін.

Асветнік **Фядот Андрэевіч Кудрынскі (19.2(3.3).1867 – 1933 г.)** (у педагагічным друку Віленскай вучэбнай акругі выступаў пад псеўданімам **Багдан Сцепанец**) выступіў у перадрэвалюцыйны час з шэрагам артыкулаў па праблеме падрыхтоўкі настаўнікаў. Паляпшэнне якасці адукацыі ён звязваў з павышэннем узроўню педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў. Выкладаць – значыць даваць вучням фактычныя карысныя веды, развіваць іх разумовыя здольнасці, цікавасць да ведаў і навучаць самастойна набываць іх. Якасць выканання гэтых задач залежыць ад дзейнасці настаўніка, ад умелага выкарыстання ім прыёмаў навучання. Прычыну нізкай эфектыўнасці настаўніцкай дзейнасці ён тлумачыў перагружанасцю вучэбных планаў, фармалізмам у навучанні, дрэнным абыходжаннем педагогаў з навучэнцамі. У педагагічных працах ім указвалася неабходнасць абавязковага ўзбраення будучых настаўнікаў ведамі навейшых дасягненняў педагогікі і псіхалогіі, укаранення новых метадаў навучання. Павышэнню майстэрства, на яго думку, садзейнічае вывучэнне падагагічнай спадчыны вядомых вучоных, педагогаў. У сувязі з гэтым ён напісаў шэраг прац, прысвечаных аналізу педагагічнай спадчыны шэрага выдатных педагогаў. Педагог меркаваў, што майстэрства настаўніка праяўляецца ў добразычлівых адносінах да дзяцей, веры ў іх магчымасці, развіцці іх творчых здольнасцей. Валоданне ўменнем убачыць схільнасць вучня, адгадаць рэальнае прызванне выхаванца, падрыхтаваць яго да будучыні – гэта і ёсць майстэрства [3, с. 247]. Задача настаўніка складаецца ў неабходнасці развіцця па магчымасці ўсіх бакоў духоўных і фізічных патрэбнасцей вучня, каб даць яму магчымасць знайсці сваё месца. Майстэрства настаўніка – гэта таксама і ўменне знайсці індывідуальны падыход. Фядот Андрэевіч Кудрынскі адзначае, што вопытны настаўнік-майстар можа і павінен знайсці сродкі ўплыву на кожнага са сваіх вучняў, не грэбаваць дрэннымі вучнямі. У педагагічным апавяданні «Первый урок о любви» стары настаўнік,

раздумваючы аб здольнасцях, гаворыць, што патрэбны не самі здольнасці вучняў, а толькі прабыванне іх у класе, «а дальше уже – дело учителя» [27, с. 14]. Менавіта аўтарытэт адыгрывае важную ролю, той давер і павага, якія сумеў узбудзіць да сябе настаўнік сваёй асобай. Ён павінен падтрымліваць ажыўленне, увагу і працу думак ва ўсіх вучнях. Вучні – гэта вены і артэрыі класа. Сэрцам, даючым жыццё гэтым артэрыям, з'яўляецца настаўнік … [3, с. 249]. Настаўнік-майстра – гэта той настаўнік, які сумеў зацікавіць вучняў сваім прадметам. Галоўная ж якасць – поўнае разуменне сваёй задачы – выхоўваць цэльнага чалавека. Для гэтага ў настаўніка ў першую чаргу павінна быць прызванне, самаадданыя адносіны да справы. Для прызванага настаўніка, удакладняе асветнік, такая справа становіцца лёгкай, прыемнай. Настаўнік павінен валодаць здольнасцямі, накіроўваючымі энергію вучняў у бок карысных, неабходных ведаў, умець ажыўляць іх жыватворнымі ведамі, стрымліваць іх у межах школьнай дысцыпліны і прывучаць да вытрыманасці і парадку. Разумеючы сваю задачу, працягвае аўтар, сапраўдны настаўнік ніколі не зойдзе ў клас з абыякавым тварам, не пачне абмяжоўваць свае абавязкі толькі пастаноўкай адзнакі за вывучаны ўрок. Псуюць дзяцей неасцярожнае слова, недарэчная ўскіпеўшая выхадка настаўніка, якія часам могуць пакінуць непазбыўны след у душы дзіцяці на доўгія гады [52, с. 11–15].

Самі па сабе веды, як указваў Багдан Сцепанец, пры адсутнасці духоўнага элемента могуць прывесці да непажаданых вынікаў. Добры настаўнік абавязкова павінен азнаёміць вучняў з практычным прымяненнем ведаў [52, с. 11–15]. Дзейнасць настаўніка таксама павінна быць накіравана на тое, каб у вучняў, пакідаючых школу, не ўзнікала сумнення аб неабходнасці маральнага прымянення атрыманай граматы. Для гэтага самому настаўніку трэба дзейнічаць тактоўна, быць прыкладам у адносінах да блізкіх, у абыходжанні з дзецьмі, уласнымі паводзінамі і ўчынкамі вучыць усіх тых, з кім прыходзіцца сутыкацца.

Сутнасць паняцця «майстэрства настаўніка» ў разуменні Фядота Андрэевіча Кудрынскага заключаецца ва ўмелым выкладанні, накіраваным на перадачу карысных фактычных ведаў. Пры майстэрскім выкладанні настаўнік развівае разумовыя здольнасці вучняў, іх цікавасць да ведаў і імкненне да самастойнага набыцця гэтых ведаў. Кампанентамі педагагічнага майстэрства ён называў:

- наяўнасць у настаўніка індывідуальнага падыходу;
- уменне станоўча ўплываць на вучняў сваёй асобай і аўтарытэтам;
- валоданне настаўніцкім прызваннем і педагагічнымі здольнасцямі.

Магчымасць павышэння майстэрства бачылася яму ў практычнай дзейнасці і набыцці практычнага вопыту, у вывучэнні, выкарыстанні і выкладанні педагагічнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прагрэсіўны педагог **Дзмітрый Антонавіч Сцяпура (1872 – год смерці невядомы)** спалучаў практычную дзейнасць з распрацоўкай пытанняў па практычнай падрыхтоўцы настаўнікаў. Гэта пытанне ён лічыў важнейшым у справе развіцця асветы і з гэтай мэтай арганізоўваў курсы, нядзельныя школы, у 1909 г. у Рагачоўскай гімназіі стварыў педагагічны музей [3, с. 271].

Вызначаючы сутнасць педагагічнага майстэрства і фармулюючы свае ўяўленні аб якасцях настаўніка-майстра, ён акцэнтуе, галоўным чынам, неабходнасць педагагічнай адукацыі.

Вядомы педагог **Клаўдзій Іванавіч Ціхаміраў (27.10(8.11).1864 – 1929 г.)** у першыя дзесяцігоддзі XX ст. звяртаў увагу настаўнікаў на неабходнасць глыбокага вывучэння дзіцячай псіхалогіі, заклікаў карыстацца данымі эксперыментальнай псіхалогіі і педагогікі. Настаўніцкія курсы і з'езды ён лічыў важным сродкам павышэння ўзроўню падрыхтоўкі і майстэрства настаўніка [4, с. 265]. Ім сцвярджалася, што педагогам-майстрам можна назваць таго настаўніка, які грунтоўна вывучыў псіхалогію дзіцяці, карыстаецца пры правядзенні ўрокаў данымі эксперыментальнай псіхалогіі і педагогікі. Майстэрскае выкладанне – умелае прымяненне нагляднага навучання, уменне данесці матэрыял да вучня і ўпэўніцца, што ён ім усвядомлены, пачуццё меры ў падборцы вучэбнага матэрыялу.

Такім чынам, асветнікі дарэвалюцыйнай Беларусі вызначалі прафесійнае майстэрства настаўніка як умела арганізаваную выкладчыцкую дзейнасць у адпаведнасці з інтарэсамі і здольнасцямі вучняў і іх узроўнем ведаў, заснаваную на выкарыстанні самастойнай дзейнасці вучняў у працэсе набыцця ведаў. Асноўнымі кампанентамі педагагічнага майстэрства імі выдзяляліся такія, як:

- ❖ комплекс прафесійна-значымых якасцей асобы;
- ❖ педагагічная адукацыя і ўмелае выкарыстанне методыкі навучання;
- ❖ усведамленне настаўнікамі неабходнасці самаадукацыі і самаўдасканалення, педагагічная культура і самадзейнасць у планаванні і правядзенні ўрокаў.

**Максім Іванавіч Гарэцкі (6(18).2.1893 – 10.2.1938 г.)**, вядомы ў першую чаргу як пісьменнік, пакінуў нямала значных педагагічных ідэй. Прыхільнік беларускай нацыянальнай ідэі і нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, ён адстойваў вартасць і перавагу беларускіх нацыянальных школ. Асвятляючы праблему нацыянальнага адраджэння ў творах «У 1920 годзе», «Апостал», «Фантазія», «Незадача», «Усебеларускі з'езд 1917-га года», Максімам Гарэцкім была сфармулявана задача – «падняць беларуса да ідэальнага чалавека», «аднавіць арганізм Беларусі і зрабіць яго дужэйшым» [2, с. 303]. Выкананне пастаўленай задачы пад сілу, на думку асветніка, такому

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

настаўніку-майстру, які выкладае на беларускай мове, ведае гісторыю свайго народа і імкнецца сваёй дзейнасцю ўзбудзіць у маладым пакаленні імкненне да нацыянальнага адраджэння [2, с. 303–305].

У асвятленні праблемы майстэрства настаўніка ў перыядычным друку **Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (22.10(13.11).1882 – 13.08.1956 г.)** прыняў непасрэдны ўдзел. Практычная выкладчыцкая дзейнасць, самастойная праца над павышэннем метадычнага ўзроўню садзейнічалі назапашванню практычнага вопыту. Падручнік «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» з'яўляецца лепшым сведкам яго настаўніцкага таленту [5, с. 431]. Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча называлі «настаўнікам» у шырокім значэнні гэтага слова, ён выхоўваў у вучняў узвышаныя імкненні і пачуцці, яму верылі і давяралі. Дасягнуўшы сваёй вяршыні прафесійнага майстэрства, ён з поўным правам мог распрацоўваць тэорыю настаўніцкага майстэрства [19, с. 410].

У дакастрычніцкі перыяд Якуб Колас выступаў супраць бяздумнай пакорнасці настаўнікаў, асуджаў іх прыніжэнне: «учитель никогда не видел и не видит добра. Вся его жизнь – одно страдание...» [45, с. 121]. Калі ж настаўнік «осмелится думать иначе», «попробует пролить луч света в тёмное село» альбо «выйти из … рамок министерской программы», заявіць аб «правах человечьих», то яго чакалі звальненне са школы альбо турма. «Когда же дождёшься ты лучшей доли, страдалец-учитель, чёрный волик на пустой ниве народного просвещения?» [21, с. 307–308]. Так вучоны гаворыць аб абавязковай умове паспяховай дзейнасці настаўніка – наяўнасці грамадзянскіх правоў.

Педагог у разуменні настаўніка – свядомы гармадзянін, шырокаадукаваны, культурны чалавек. Адметная рыса настаўніка-майстра – чыстае сумленне, глыбокая вера ў сэнс сваёй справы. Любоў да працы і захопленасць ёй дапамагаюць пераносіць шматлікія нягоды на прафесійным шляху. Настаўнікаў, якія падносяць сваім вучням непатрэбныя веды, якія нельга прымяніць у жыцці, і выконваюць свае абавязкі шаблонна, без натхнення і творчасці, вялікі педагог называў рамеснікамі. Прычынамі недахопу ў навучаючых творчых адносін да настаўніцкай справы тлумачыліся ім перагружанасцю і launched пeратамленнем. «Адзіночны метад навучання» ён лічыў прыкладам педагагічнай руціны [45, с. 124]. У руцінёрстве, па меркаванні асветніка, вінаваты, канешне, і сацыяльныя ўмовы, у якіх працаваў настаўнік.

Педагогам была вызначана кіруючая роля настаўніка ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, майстэрства – як яго ўменне пры навучанні дзяцей выйсці за рамкі школьнай праграмы, навучыць іх крытычна разважаць, асэнсавана адносіцца да сябе і да сваіх учынкаў [3, с. 312]. Ім віталіся пераўтварэнні ў падрыхтоўцы настаўнікаў, бо, як ён пісаў, поспех школьнай справы залежыць у першую чаргу ад перанараджэння саміх педагогаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўспрыняцця імі новых ідэй, ад змянення іх метадычнай і арганізацыйнай работы [33, с. 3]. Толькі сапраўдны настаўнік прыносіць карысць, а такі настаўнік, у разуменні Якуба Коласа, мае не толькі агульную і спецыяльную педагагічную адукацыю і любіць дзяцей [23, с. 412]. Сапраўдны педагог-майстар – той, хто раздумвае над лёсам усяго грамадства, навучае і выхоўвае падрастаючае пакаленне ў духу разумення імкненняў народа [34, с. 253]. Ва ўмовах нацыянальнай палітыкі, на думку педагога, ажыццяўленне такога навучання магчыма было толькі на роднай мове. Гэта патрабаванне, тлумачыў далей аўтар, не з'яўлялася палітычным: яно супадала з педагагічнымі поглядамі сучаснасці на працэс выхавання дзіцяці [32, с. 5–6].

Пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. Якуб Колас працягваў прад'яўляць патрабаванне аб надзяленні настаўніка шырокімі грамадскімі правамі, бо настаўнік павінен быць сапраўдным асветнікам народа і адпавядаць свайму назначэнню – быць магутнай асветніцка-выхаваўчай сілай, якая ў стане забяспечыць «высокую степень культуры и настоящего прогресса» [22, с. 40].

Майстэрства настаўніка, на думку педагога, праяўляецца ў тактычных адносінах да вучняў, павазе іх годнасці, веданні індывідуальных асаблівасцей [45, с. 126]. Майстэрства педагога – гэта і валоданне мастацтвам навучання і выхавання, веданне патрабаванняў сучаснай педагогікі. Вельмі важна, падкрэсліваў неаднаразова педагог, каб настаўнік умеў кіраваць мысленнем дзяцей, працэсам засваення ведаў. Акрамя таго, педагог-майстар абавязкова павінен быць і сацыяльным педагогам – умець наладжваць кантакт з бацькамі вучняў, грамадскасцю, ажыццяўляць працу па-за школай.

Увесь комплекс гэтых сацыяльных, псіхалагічных і педагагічных патрабаванняў да настаўніка, на думку Якуба Коласа, павінен знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі. У разуменні Якуба Коласа настаўнік-майстар з'яўляецца свядомым грамадзянінам, знаўцам гісторыі свайго народа, шырокаадукаваным і культурным чалавекам. Гэта праяўляецца ў яго адносінах да людзей, у турботах аб дзецях, у шчырым жаданні навучыць дзяцей самастойна разважаць і падрыхтаваць іх да самастойнага жыцця [7, с. 67].

Настаўніцкае майстэрства ў разуменні Якуба Коласа – гэта свядомае творчае выкананне педагогам сваіх прафесійных абавязкаў, спалучанае з рацыянальный затратай часу і намаганняў вучняў. Крытэрыі майстэрства называліся ім самыя высокія:

- ❖ адпаведнасць педагагічнаму прызванню;
- ❖ педагагічная адукацыя і практычны вопыт;
- ❖ дасканалае валоданне методыкай выкладаемага прадмета;
- ❖ рознабаковыя навуковыя веды, працоўныя і інтэлектуальныя ўменні і навыкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- глыбокая дасведчанасць у патрабаваннях і тэндэнцыях грамадскага развіцця;
- уменне весці сацыяльную працу;
- агульная культура і высокая нацыянальная самасвядомасць.

Дасягненне вяршыні прафесійнага майстэрства Якубу Коласу бачылася магчымым пры ўмове надзялення настаўніка шырокімі грамадскімі правамі.

**Сяргей Канстанцінавіч Паўловіч (13(25).09.1875 – 16.09.1940 г.),** вызначаючы сутнасць настаўніцкага майстэрства, рабіў акцэнт на авалодванні методыкай выкладаемага прадмета. У сувязі з гэтым асобае месца ў навуковай дзейнасці ён аддаваў складанню падручнікаў і практычных дапаможнікаў для настаўнікаў. Толькі дасканала валодаючаму методыкай выкладаемага прадмета настаўніку магчыма дабіцца станоўчых вынікаў у дасягненні мэты – выкладанні тэарэтычных і практычных ведаў. Бездакорнае кіраванне настаўнікам патрабаваннямі практычных дапаможнікаў разглядалася Сяргеем Канстанцінавічам Паўловічам як умова фарміравання майстэрства. Вучоны прызнаваў, што вызначаны шаблон для правядзення ўрока даць немагчыма, але папярэдняе планаванне працы, штодзённая падрыхтоўка і выкарыстанне магчыма большай колькасці метадаў і прыёмаў садзейнічаюць пасняховасці навучання і ўдасканальванню прафесійнай дзейнасці [39, с. 104].

Уменне падбору вучэбнага матэрыялу, з дапамогай якога развіваюцца творчыя сілы дзяцей, і імі ў поўнай меры ўспрымаецца сувязь напісанага і ўнутранага сэнсу, – гэта і ёсць майстэрскія адносіны да справы. Падкрэсліваючы вядучую педагагічную ідэю свайго часу аб эфектыўным выкарыстанні працы вучня, яго самадзейнасці і актыўнасці, асветнік адзначаў неабходнасць злучаць навучанне з самастойна пераж ытымі вучнямі з’явамі і назіраннямі. Праяўленне вучнямі самадзейнасці пры навучанні садзейнічае іх усебаковаму развіццю і адукацыі. У той жа час аўтар акцэнтаваў увагу, што выкананне гэтай нялёгкай задачы пад сілу настаўніку, які мае ўсе магчымасці для шырокай, творчай і свабоднай працы, пры ўмове, што ён не працуе аднача сова з некалькімі групамі вучняў рознага ўзросту. Галоўнай адметнай рысай настаўніка-майстра вучоны лічыць няўхіленне ад выбранага шляху і імкненне давесці вучняў да пастаўленай мэты [38, с. 5–6]. Адстойваючы ідэю пабудовы беларускай нацыянальнай школы, Сяргей Канстанцінавіч сцвярджаў, што ў такой школе пераважнае права вучыць дзяцей мае беларускі настаўнік, які ведае гісторыю свайго краю, нацыянальныя імкненні і патрабаванні народа [37, с. 3]. Такі настаўнік, па словах вучонага, мае погляды на гісторыю і сучаснасць, супадаючыя з поглядамі народа, зможа ў поўнай меры забяспечыць індывідуальны падыход у навучанні. Акрамя таго, настаўнік нацыянальнай школы павінен навучаць па кнігах на роднай мове, карыстацца ў выкладанні пераважна прыкладамі з беларускіх літаратурных твораў, з гісторыі і жыцця

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

свайго народа [37, с. 16]. Прафесійнае майстэрства ў разуменні Сяргея Канстанцінавіча Паўловіча – гэта дзейнасць настаўніка, якая спалучае ў сабе шырокую, творчую і свабодную працу, наяўнасць веры ў поспех пастаўленай мэты. Майстэрскае выкананне прафесійнай дзейнасці настаўніка нацыянальнай школы, на думку вучонага, заключае ў сабе:

- дасканалае валоданне роднай мовай;
- веданне гісторыі свайго народа і прымяненне гэтых ведаў на ўроку;
- валоданне методыкай выкладаемага прадмета;
- уменне развіваць творчыя сілы дзяцей;
- уменне падбіраць вучэбны матэрыял.

20-я гг. – найбольш актыўны перыяд па распрацоўцы тэарэтычных педагагічных праблем для доктара педагагічных навук, акадэміка **Паўла Якаўлевіча Панкевіча (1895 – 1944 г.)** [26, с. 203]. Разам з такімі педагагічнымі праблемамі разглядаемага перыяду, як політэхнічная і прафесійная адукацыя, ён не абыходзіў тэму прафесійнага майстэрства. Новая школа ставіла перад педагогамі новыя задачы. Выкананне іх было пад сілу толькі такому настаўніку, які самаўдасканальваецца, імкнецца да вяршыні прафесійнага майстэрства. Новы педагог павінен быў умець прадстаўляць веды не ізалявана ад жыцця, а пры непасрэдным удзеле школьнікаў у вытворчым працэсе [36, с. 186]. Вучоны падкрэсліваў, што дзейнасць майстэрскі выконваючага сваю працу настаўніка павінна быць абавязкова сацыяльна накіраванай. Такое выхаванне развівае грамадскую самасвядомасць. З'яўляючыся адным з заснавальнікаў беларускай нацыянальнай школы, ён гаварыў, што настаўнік у новай школе абавязан валодаць беларускай мовай, ведаць гісторыю свайго народа [2, с. 262].

Прафесійнае майстэрства, на думку Паўла Якаўлевіча Панкевіча, прадугледжвае сацыяльна накіраваную дзейнасць настаўніка, звязанае з рэчаіснасцю выкладанне пры ўмове непасрэднага ўдзелу школьнікаў у вытворчым працэсе. Абавязковым адрозненнем настаўніка-майстра ім называлася валоданне беларускай мовай і веданне гісторыі народа.

Сваю навукова-даследчыцкую дзейнасць педагог-метадыст **Васіль Андрэевіч Самцэвіч (1889 – 1973 г.)** таксама распачаў у 20-я гг. мінулага стагоддзя. У артыкулах, надрукаваных у часопісе «Асвета», ён закранаў пытанні дзейнасці педагагічных калектываў, павышэння ўзроўню выкладання [26, с. 212]. Метадыст указваў, што ў дасягненні прафесійнага майстэрства настаўніку важна дамагацца, каб кожны ўрок даваў вучням нешта новае, быў прыступкай у набыцці імі новых ведаў і ўменняў. Пры гэтым настаўнік павінен ведаць і памятаць сам і навучаць гэтаму сваіх вучняў: каб ісці наперад, трэба не забываць, а паўтараць і ўдасканальваць раней пройдзенае. Эфектыўнасць урока залежыць ад настаўніка, ад яго падрыхтоўкі і любові да дзяцей, ад яго ўмення

злучаць навучанне з выхаваннем на аснове высокіх маральных якасцей, ад жадання і ўменне выкарыстоўваць вопыт перадавых настаўнікаў [3, с. 370–371].

Асноўная ўвага ў асветніцкай дзейнасці педагога-практыка **Браніслава Адамавіча Тарашкевіча (8(20).1.1892 – 29.11.1938 г.)** была сканцэнтравана ў 20-я гг. на арганізацыі педагагічнага інстытута, адкрыцці беларускіх школ, выданні беларускіх школьных падручнікаў, у якіх так мела патрэбу айчынная школа. Ён прысвячаў сябе тым справам, якія былі найболей патрэбнымі і карыснымі ў гэты перыяд беларускаму народу [8, с. 37]. Браніслава Адамавіча Тарашкевіча называюць сімвалам таго, што прынесла XX ст. Разумеючы, што самасвядомасць народа звязана з ведамі ўласнай гісторыі, ён пайшоў далей сваіх папярэднікаў, якія займаліся вывучэннем мінуўшчыны. Асветнік у першую чаргу думаў аб неабходнасці распаўсюджвання адукацыі на роднай мове і аб будучыні беларускай літаратурнай мовы [8, с. 37].

У метадычных рэкамендацыях вучоны прад'яўляў свае патрабаванні да якаснага выкладання прадметаў, вызначыў крытэрыі майстэрскай дзейнасці выкладчыка. Галоўным крытэрыям майстэрскага падыходу да выканання выкладчыцкіх абавязкаў настаўнікам у беларускай школе ім называлася валоданне роднай мовай і выкладанне прадметаў на беларускай мове [54, с. 4], [53, с. 4]. У артыкуле «Беларуская школа і беларуская кніжка» вучоны сцвярджаў, што адраджэнне нацыянальнай школы нельга ажыццявіць без беларускіх падручнікаў [55, с. 58]. Ён абараняе беларускага настаўніка, адстойвае яго прыярытэтныя правы ў адраджэнні нацыянальнай самасвядомасці народа: «… чым горшы беларускі вучыцель?» [55, с. 60]. У дакладзе 5 снежня 1923 г. на 84-м пасяджэнні сейма Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч заклікаў да заснавання беларускай настаўніцкай семінарыі, арганізацыі курсаў павышэння кваліфікацыі беларускіх настаўнікаў і субсідзіравання беларускіх школ [7, с. 125]. Павышэнню прафесіяналізму настаўнікаў вучоны надае важнейшае значэнне, так як ад іх залежала адраджэнне нацыянальнай школы і грамадскай свядомасці ў цэлым.

Як і яго сучаснікі, Браніслаў Тарашкевіч надаваў асобае значэнне ўсвядомленаму навучанню. Задача настаўніка – данесці да вучня новы матэрыял такім чынам, каб ён прымяняўся школьнікам на наступных уроках асэнсавана, а не як нешта механічна завучанае. У гэтым і праяўляецца майстэрства педагога. Важна адзначыць, што вучоным падкрэслівалася значэнне прызнання ў вучні асобы, павагі яго поглядаў. Так, аўтар указваў, што, папраўляючы памылкі, настаўнік ні ў якім разе не павінен падкрэсліваць іх, так як гэтым можа быць закранута самапавага вучня і адмоўна паўплываць на яго жаданне вучыцца. Педагог-майстар паставіць так вучэбную справу, што навучанне будзе суправаджаць усе этапы ўрока, уключаючы кантроль ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч, такім чынам, сцвярджаў, што майстэрская дзейнасць настаўніка – гэта асэнсаванае выкладанне, заснаванае на прызнанні ў кожным вучні асобы, павазе яго поглядаў. Як адзін з заснавальнікаў нацыянальнай школы, галоўным паказчыкам прафесійнага майстэрства айчыннага педагога ён называў выкладанне на беларускай мове.

Падводзячы вынік аналізу педагагічных поглядаў педагогаў-тэарэтыкаў паслярэвалюцыйнай Беларусі, можна сказаць, што ў аснову ўяўленняў аб прафесійным майстэрстве настаўніка ў разглядаемы перыяд быў пакладзены нацыянальна-культурны аспект. Беларусізацыя, ахапіўшая развіццё нацыянальнай літаратуры, выданне кніг і ўсебаковае навукова-даследчыцкае вывучэнне Беларусі аказалі рашучы ўплыў на фарміраванне ўяўленняў аб педагагічным майстэрстве [49, с. 208].

Прафесійнае майстэрства настаўніка вызначалася як дзейнасць, заснаваная ў першую чаргу на глыбокім веданні гісторыі і нацыянальных імкненняў свайго народа, і якая садзейнічала ўмацаванню нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Майстэрскае выкананне сваіх прафесійных абавязкаў прадугледжвала прымяненне навейшых дасягненняў метадычнай і педагагічнай навукі, педагагічнага вопыту папярэдніх пакаленняў. Асноўнымі складаючымі прафесійнай дзейнасці настаўніка-майстра называліся:

- валоданне беларускай мовай;
- веданне нацыянальных імкненняў народа;
- усведамленне ўскладзеных грамадскіх задач;
- сацыяльная накіраванасць прафесійнай дзейнасці;
- сувязь навучання з жыццём;
- агульная культура і высокая нацыянальная самасвядомасць;
- развіццё актыўнасці вучняў у працэсе навучання і развіццё іх самадзейнасці.

Шляхі фарміравання настаўніцкага майстэрства прадстаўнікамі беларускай педагагічнай навукі бачыліся ў:

- забеспячэнні будучых настаўнікаў якаснай навуковай адукацыяй;
- магчымасці павышэння прафесійнага майстэрства на з’ездах, курсах і г. д.;
- паляпшэнні ўмоў выкладчыцкай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Праверым свае веды

**1. Каму з пералічаных асветнікаў належаць словы: «каков учитель, такова и школа»?**

а) Адаму Ягоравічу Багдановічу;

б) Канстанціну Васільевічу Яльніцкаму;

в) Міхаілу Васільевічу Радзевічу.

**2. Якое з прыведзеных сцвярджэнняў адпавядае рэчаіснасці пачатку ХХ ст.?**

а) усе выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў мелі вышэйшую педагагічную адукацыю;

б) усе выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў не мелі вышэйшай педагагічнай адукацыі;

в) амаль усе выкладчыкі сярэдніх навучальных устаноў не мелі педагагічнай адукацыі;

**3. Які настаўнік, на думку А. Я. Багдановіча, зможа дасягнуць прафесійнага ўдасканалення?**

а) настаўнік, які зможа заваяваць аўтарытэт сярод дзяцей дзякуючы сваім паводзінам, адносінам да дзяцей і акружаючых людзей;

б) настаўнік, які прайшоў курс навучання у адной з вышэйшых педагагічных устаноў Расіі;

в) настаўнік, які ўмее кіраваць, загадваць і падпарадкоўваць сабе дзяцей.

**4. Назавіце асноўныя састаўныя часткі прафесійнага майстэрства, паводле А. Я. Багдановіча.**

а) навуковая падрыхтоўка;

б) глыбокае разуменне псіхалогіі дзяцей;

в) дасканалае веданне роднай мовы навучэнцаў.

**5. Які сэнс укладаў А. Я. Багдановіч у паняцце «рацыянальнае выкладанне»?**

а) «рацыянальнае выкладанне» – гэта рацыянальнае выкарыстанне часу, адведзенага на тлумачэнне новай тэмы;

б) «рацыянальнае выкладанне» – выкарыстанне часу, прызначанага для праверкі хатніх заданняў, для іншых мэт;

в) «рацыянальнае выкладанне» – гарманічнае развіццё ўсіх здольнасцей вучня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Якая з прыведзеных ніжэй фармуліровак паняцця «прафесійнае майстэрства» адпавядае поглядам А. Я. Багдановіча на абазначаную праблему?**

а) прафесійнае майстэрства настаўніка – умелае выкладанне, накіраванае на перадачу карысных фактычных ведаў;

б) прафесійнае майстэрства настаўніка – умелае прымяненне нагляднага навучання, уменне данесці матэрыял да вучня і ўпэўніцца, што ён ім быў усвядомлены;

в) прафесійнае майстэрства настаўніка – «рацыянальнае выкладанне», накіраванае на развіццё вучняў, выхавання ў іх імкнення самастойна набываць веды.

**7. Што, паводле А. Я. Багдановіча, не з'яўляецца абавязковай часткай прафесійнага майстэрства?**

а) самаадукацыя настаўніка як яго ўнутраная патрэбнасць;

б) веданне методыкі выкладаемага прадмета;

в) уменне праводзіць сацыяльную работу.

**8. Назавіце абавязковую ўмову фарміравання прафесійнага майстэрства, на думку К. В. Яльніцкага.**

а) самаадукацыя і самавыхаванне настаўніка;

б) развіццё значных для педагагічнай працы асабістых якасцей настаўніка;

в) прымяненне настаўнікам на ўроках рацыянальнага выкладання.

**9. Што педагог-метадыст Канстанцін Васільевіч Яльніцкі лічыў ядром працэсу навучання і крыніцай духоўнасці і культуры народа?**

а) гістарычнае мінулае Бацькаўшчыны;

б) родную мову;

в) рэлігійнае выхаванне.

**10. Які з пералічаных ніжэй кампанентаў педагагічнага майстэрства не вылучаўся К. В. Яльніцкім?**

а) разумная любоў да дзяцей;

б) самавалоданне настаўніка;

в) самаразвіццё і самаадукацыя настаўніка.

**11. Каму з асветнікаў належаць педагагічныя працы «Купцы – реформаторы гимназий», «В народной школе», «Несколько слов об учительских институтах», «На уроках. (Из записок учителя)»?**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) М. В. Радзевічу;

б) Ф. А. Кудрынскаму;

в) Б. Сцепанцу.

**12. Што Міхаіл Васільевіч Радзевіч разглядаў як аснову пасяховай дзейнасці настаўніка і далейшага фарміравання яго майстэрства?**

а) прадастаўленая настаўніку магчымасць самастойна распрацоўваць школьную праграму;

б) права настаўніка вызначаць колькасць гадзін на выкладаемы прадмет;

в) распрацаваны разумны распарадак у вучэбнай установе.

**13. Якое з пералічаных сцвярджэнняў належыць М. В. Радзевічу?**

а) педагагічнае майстэрства – умела наладжаныя ўзаемаадносіны навучаючага і навучаючыхся, якое дазваляе настаўніку дасягаць найлепшых вынікаў у падачы ведаў сваім вучням;

б) педагагічнае майстэрства – умелае выкладанне, накіраванае на перадачу карысных фактычных ведаў;

в) педагагічнае майстэрства – умела арганізаваная выкладчыцкая дзейнасць навучаючага ў адпаведнасці з інтарэсамі і здольнасцямі вучняў і ўзроўнем іх ведаў.

**14. Пад якім псеўданімам выступаў у педагагічным друку асветнік Фядот Андрэевіч Кудрынскі?**

а) Янка Лучына;

б) Багдан Сцепанец;

в) Учитель.

**15. З чым звязваў Ф. А. Кудрынскі паляпшэнне якасці адукацыі?**

а) з павышэннем узроўню педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў;

б) з павелічэннем колькасці сярэдніх агульнаадукацыйных навучальных устаноў;

в) з ростам колькасці вышэйшых навучальных устаноў.

**16. Што, на думку Ф. А. Кудрынскага з’яўлялася прычынай нізкай эфектыўнасці настаўніцкай дзейнасці?**

а) перагружанасць вучэбных планаў;

б) фармалізм у навучанні;

в) наяўнасць вялікай колькасці школьных падручнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**17. Чаму садзейнічала, на думку Багдана Сцепанца, вывучэнне педагагічнай спадчыны вядомых вучоных, педагогаў?**

а) пашырэнню кругагляду настаўнікаў;

б) больш глыбокаму азнаямленню з гісторыка-педагагічнай спадчынай;

в) павышэнню майстэрства настаўнікаў.

**18. У чым бачылася Ф. А. Кудрынскаму магчымасць павышэння майстэрства настаўніка?**

а) у практычнай дзейнасці і набыцці практычнага вопыту;

б) у вывучэнні і выкарыстанні на ўроках спадчыны вялікіх педагогаў;

в) у правядзенні заняткаў-экскурсій з вучнямі.

**19. Што Дзмітрый Антонавіч Сцяпура лічыў важнейшым у справе развіцця асветы?**

а) адкрыццё вышэйшых педагагічных устаноў;

б) распрацоўку пытанняў па практычнай падрыхтоўцы настаўнікаў;

в) самастойную працу настаўнікаў над павышэннем метадычнага ўзроўню.

**20. Што, на думку Клаўдзія Іванавіча Ціхамірава, з'яўляецца важнейшым сродкам павышэння ўзроўню падрыхтоўкі і майстэрства настаўніка?**

а) настаўніцкія курсы і з'езды;

б) самастойнае вывучэнне дапаможнікаў па методыцы выкладання школьных прадметаў;

в) адкрыццё настаўнікамі педагагічных музеяў.

**21. Як вызначалі паняцце «прафесійнае майстэрства настаўніка» асветнікі дарэвалюцыйнай Беларусі?**

а) майстэрства настаўніка – умела арганізаваная выкладчыцкая дзейнасць навучаючага ў адпаведнасці з інтарэсамі і здольнасцямі вучняў і іх узроўнем ведаў, заснаваная на выкарыстанні самастойнай дзейнасці вучняў у працэсе набыцця ведаў;

б) майстэрства настаўніка – свядомае творчае выкананне педагогам сваіх прафесійных абавязкаў, спалучанае з рацыянальнай затратай часу і намаганняў вучняў;

в) майстэрства педагога – дзейнасць настаўніка, якая спалучае ў сабе шырокую, творчую і свабодную працу, наяўнасць веры ў поспех пастаўленай мэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**22. Якому настаўніку, на думку Максіма Іванавіча Гарэцкага, пад сілу выкананне пастаўленай ім задачы: «падняць беларуса да ідэальнага чалавека», «аднавіць арганізм Беларусі і зрабіць яго дужэйшым»?**

а) настаўніку-майстру, які выкладае на беларускай мове, ведае гісторыю свайго народа і імкнецца сваёй дзейнасцю ўзбудзіць у маладым пакаленні імкненне да нацыянальнага адраджэння;

б) настаўніку-майстру, які пры выкладанні карыстаецца данымі эксперыментальнай псіхалогіі і педагогікі;

в) настаўніку-майстру, які любіць сваю працу і верыць у сэнс выконваемай справы.

**23. Што, на думку Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча, з'яўляецца адметнай рысай настаўніка-майстра?**

а) чыстае сумленне і глыбокая вера ў сэнс сваёй справы;

б) веданне дзіцячай псіхалогіі;

в) прымяненне на практыцы навейшых дасягненняў педагогікі і псіхалогіі.

**24. Як К. М. Міцкевіч вызначаў педагагічнае майстэрства?**

а) педагагічнае майстэрства праяўляецца ва ўменні і імкненні настаўніка сваёй дзейнасцю ўзбудзіць у маладым пакаленні імкненне да нацыянальнага адраджэння;

б) настаўніцкае майстэрства – уменне пры навучанні дзяцей выйсці за рамкі школьнай праграмы, навучыць іх крытычна разважаць, асэнсавана адносіцца да сябе і да сваіх учынкаў;

в) майстэрства настаўніка – валоданне методыкай выкладаемага прадмета і бездакорнае кіраванне настаўнікам патрабаваннямі практычных дапаможнікаў.

**25. Які з пералічаных ніжэй крытэрыяў настаўніцкага майстэрства не выдзяляўся Якубам Коласам?**

а) адпаведнасць педагагічнаму прызванню;

б) глыбокая дасведчанасць у патрабаваннях і тэндэнцыях грамадскага развіцця;

в) выкарыстанне ў практычнай дзейнасці «адзіночнага метаду выкладання».

**26. Што, на думку Сяргея Канстанцінавіча Паўловіча, з'яўляецца галоўнай умовай фарміравання майстэрства настаўніка?**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) бездакорнае кіраванне настаўнікам патрабаваннямі практычных дапаможнікаў;

б) надзяленне настаўніка шырокімі грамадскімі правамі;

в) «самадзейнасць» настаўніка пры выкладанні школьных прадметаў.

**27. Якую накіраванасць павінна мець дзейнасць майстэрскі выконваючага сваю працу настаўніка на думку Паўла Якаўлевіча Панкевіча?**

а) грамадскую накіраванасць;

б) палітычную накіраванасць;

в) сацыяльную накіраванасць.

**28. Аб чым, на думку педагога-метадыста Васіля Андрэевіча Самцэвіча, трэба памятаць настаўніку пры дасягненні прафесійнага майстэрства?**

а) кожны ўрок павінен даваць вучням нешта новае, быць прыступкай у набыцці імі новых ведаў і ўменняў;

б) вучні павінны непасрэдна ўдзельнічаць у вытворчым працэсе;

в) выдатна валодаць беларускай мовай і выкладаць усе прадметы на беларускай мове.

**29. Назавіце галоўны крытэрый майстэрскага падыходу да выканання выкладчыцкіх абавязкаў, які выдзяляў Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч.**

а) валоданне роднай мовай і выкладанне прадметаў на беларускай мове;

б) уменне настаўніка злучаць навучанне з выхаваннем у вучнях высокіх маральных якасцей;

в) выкарыстанне пры выкладанні вопыту перадавых настаўнікаў.

**30. Як вызначалася сутнасць прафесійнага майстэрства педагогамі-тэарэтыкамі паслярэвалюцыйнай Беларусі?**

а) майстэрская дзейнасць настаўніка – гэта асэнсаванае выкладанне, заснаванае на прызнанні ў кожным вучні асобы, павазе яго поглядаў;

б) прафесійнае майстэрства настаўніка – дзейнасць, заснаваная ў першую чаргу на глыбокім веданні гісторыі і нацыянальных імкненняў свайго народа, і якая садзейнічае ўмацаванню нацыянальнай свядомасці беларускага народа.

в) прафесійнае майстэрства – сацыяльна накіраваная дзейнасць настаўніка, звязанае з рэчаіснасцю выкладанне пры ўмове непасрэднага ўдзелу школьнікаў у вытворчым працэсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Працуем самастойна

### Заданне 1

Абапіраючыся на тэкст дапаможніка (I. Гістарычны агляд станаўлення паняцця «педагагічнае майстэрства» ў гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі (да канца XIX ст.) і выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, апішыце вобраз настаўніка-майстра згодна з уяўленнямі пералічаных асветнікаў Беларусі:

– Францыска Скарыны;
– Сымона Буднага;
– Сімяона Полацкага;
– Рыгора Іванавіча Карташэўскага;
– Казіміра Нарбута;

### Заданне 2

Абапіраючыся на тэкст дапаможніка (III. Погляды на праблему прафесійнага майстэрства настаўніка ў працах тэарэтыкаў педагагічнай навукі Беларусі ў першай трэці XX ст.) і выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, апішыце вобраз настаўніка-майстра згодна з уяўленнямі пералічаных асветнікаў дарэвалюцыйнай і паслярэвалюцыйнай Беларусі:

– Адама Ягоравіча Багдановіча;
– Канстанціна Васільевіча Яльніцкага;
– Міхаіла Васільевіча Радзевіча;
– Фядота Андрэевіча Кудрынскага (Багдана Сцепанца);
– Дзмітрыя Антонавіча Сцяпуры;
– Клаўдзія Іванавіча Ціхамірава;
– Максіма Іванавіча Гарэцкага;
– Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча;
– Сяргея Канстанцінавіча Паўловіча;
– Паўла Якаўлевіча Панкевіча;
– Васіля Андрэевіча Самцэвіча;
– Бранілава Адамавіча Тарашкевіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заданне 3**

Абапіраючыся на тэкст дапаможніка (I. Гістарычны агляд станаўлення паняцця «педагагічнае майстэрства» ў гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі (да канца XIX ст.); II. Праблема падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў Беларусі ў пачатку XX ст.; III. Погляды на праблему прафесійнага майстэрства настаўніка ў працах тэарэтыкаў педагагічнай навукі Беларусі ў першай трэці XX ст.) і выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, вызначце сутнасць і крытэрыі прафесійнага майстэрства настаўніка згодна з уяўленнямі педагогаў-тэарэтыкаў дарэвалюцыйнай і паслярэвалюцыйнай Беларусі, вызначце адрозненні і паспрабуйце іх абгрунтаваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Адказы да тэстаў

І. Гістарычны агляд станаўлення паняцця «педагагічнае майстэрства» ў гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі (да канца XIX ст.).

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **1**. – б. | **2**. – в. | **3**. – а. | **4**. – б. | **5**. – а. |
| **6**. – в. | **7**. – а, б. | **8**. – а. | **9**. – а, б. | **10**. – в. |
| **11**. – б. | **12**. – в. | **13**. – в. | **14**. – а. | **15**. – б. |
| **16**. – в. | **17**. – в. | **18**. – б. | **19**. – б. | **20**. – а. |

ІІ. Праблема падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў Беларусі ў пачатку XX ст.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **1.** – б. | **2.** – в. | **3.** – а. | **4.** – б. | **5.** – а. |
| **6.** – а. | **7.** – а. | **8.** – в. | **9.** – б. | **10.** – в. |
| **11.** – а. | **12.** – а. | **13.** – в. | **14.** – в. | **15.** – б. |
| **16.** – а. | **17.** – а. | **18.** – б. | **19.** – а, б. | |

ІІІ. Погляды на праблему прафесійнага майстэрства настаўніка ў працах тэарэтыкаў педагагічнай навукі Беларусі ў першай трэці XX ст.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **1.** – а. | **2.** – в. | **3.** – а. | **4.** – а, б. | **5.** – в. |
| **6.** – в. | **7.** – в. | **8.** – б. | **9.** – б. | **10.** – в. |
| **11.** – а. | **12.** – в. | **13.** – а. | **14.** – б. | **15.** – а. |
| **16.** – а, б. | **17.** – в. | **18.** – а, б. | **19.** – б. | **20.** – а. |
| **21.** – а. | **22.** – а. | **23.** – а. | **24.** – б. | **25.** – в. |
| **26.** – а. | **27.** – в. | **28.** – а. | **29.** – а. | **30.** – б. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Літаратура


1. XI з’езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі (22–29 лістапада 1927 году) Стэнаграфічная справаздача. Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928. – 478 с.
2. Андрэева, Е.Г. Гісторыя народнай адукацыі Беларусі (1917 – 1941): вучэб. дапам. / Е.Г. Андрэева. – Мінск: НПТАА «ПІАН», 2001. – 320 с.
3. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. Э.К. Дорошевич, М.С. Мятельский, П.С. Солнцев. – М.: Педагогика, 1986. – 468 с.
4. Арамаў, І. Асновы педалогіі / І. Арамаў.– Мінск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1929. – 218 с.
5. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / М.А. Ткачоў [і інш.]; пад рэд. М.А. Лазарука. – Мінск: Нар. асвета, 1985. – 464 с.
6. Асветнікі зямлі беларускай: X – пачатак XX ст. Энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]; маст. У.М. Жук. – 2-е выд. – Мінск: БелЭн, 2006. – 496 с.
7. Барстак, М. Пісьменнік, педагог і выхавацель / М. Барстак // Народны настаўнік Якуб Колас: зборнік артыкулаў. – Мінск, 1966. – С. 62–87.
8. Бергман, А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча / А. Бергман. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 192 с.
9. Богданович, А.Е. Школьная страда / А.Е. Богданович // Гродненские губернские ведомости. – 1894. – № 44. – С. 2.
10. Богданович, А.Е. Школьная страда / А.Е. Богданович // Гродненские губернские ведомости. – 1894. – № 47. – С. 3.
11. Богуславский, М.В. Очерки истории отечественного образования XIX – XX веков / М.В. Богуславский. – Москва: Изд-во Моск. культурологич. лицея № 1310, 2002. – 96 с.
12. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэдкал.: К.І. Шабуня (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – Т. 2: Асвета, навуковыя і культурна-асветніцкія ўстановы і таварыствы. / В.А. Цыбуля. – 1972. – 688 с.
13. Дубровский, В.В. Казимир Нарбут / под ред. С.А. Подокшина. – Минск.: Наука и техника, 1979. – 136 с.
14. Евдокимова, Е.Л.: Гимназическое образование в Беларуси: исторический опыт и тенденции развития (XIX – нач. XX вв.) / Е.Л. Евдокимова. – Минск: НИО, 1998. – 140 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**15.** Зайцев, В.К. Францишек Скорина и гуманистическая мысль в Белоруссии XV – XVI вв.: автореф. дис. … д-ра филол. наук.: 10.01.03 / В.К. Зайцев. – Минск, 1970. – 66 с.
**16.** Звонарёва, Л.У. Творчество Симеона Полоцкого: истоки, традиции, влияния: автореф. дис. … канд. филол. наук.: 10.01.01 / Л.У. Звонарёва. – Минск, 1988. – 22 с.
**17.** История Белорусской ССР / редкол.: И.М. Игнатенко [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1977. – 632 с.
**18.** История просвещения в Белоруссии: учеб. пособие-справочник. – Витебск, 1996. – 78 с.
**19.** Казека, Я. Жыццё – найцікавейшая кніга / Я. Казека // Вялікі пясняр беларускага народа: зб. арт. аб жыцці і дзейнасці Якуба Коласа / склад. І. Жыдовіч [і інш.]; гал. рэд. П. Броўка. – Мінск, 1959. – С. 394 – 420.
**20.** Ковкель, И.И., Ярмусик, Э.С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Минск: Аверсэв, 2000. – 592 с.
**21.** Колас, Я. Аб народным вучыцелю / Я. Колас // Зб. тв.: у 14 т. – Мінск, 1976. – Т. 12. – С. 307–308.
**22.** Колас, Я. Задачы савецкай школы / Я. Колас // Зб. тв.: у 14 т. – Мінск, 1976. – Т. 12. – С. 39–42.
**23.** Колас, Я. Из письма Антонине Феликсовне Харкевич от 15 июля 1944 г. / Я. Колас // Зб. тв.: у 14 т. – Мінск, 1977. – Т. 13. – С. 412–413.
**24.** Красовский, Н.И. Высшая школа Советской Белоруссии. 2-е изд., перераб. и расшир. / Н.И. Красовский. – Минск: Вышэйш. шк., 1972. – 332 с.
**25.** Краткий обзор деятельности МНП за время управления покойного министра Н.П. Боголепова (12-го февраля 1898 года – 14-го февраля 1901 года) // Журнал Министерства Народного Просвещения. – СПб: тип. В.С. Балашева, 1901. – Ч. CCCXXXV. – С. 3–82.
**26.** Крот, М.С., Логінава, Т.У. На шляхах станаўлення педагагічнай навукі / М.С. Крот, Т.У. Логінава // Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917 – 1945) / Г.Р. Сянькевіч [і інш.]; пад рэд. Г.Р. Сянькевіч. – Мінск, 1993. – С. 196–223.
**27.** Кудринский, Ф.А. Первый урок о любви / Ф.А. Кудринский. – Вильня: Эдитор, 1915. – 71 с.
**28.** Латыш, М.І., Снапкоўская, С.В., Еўдакімава, А.Л. Рэфармаванне сістэмы адукацыі (пачатак XIX – канец XX ст.): пошукі і дасягненні / М.І. Латыш, С.В. Снапкоўская, А.Л. Еўдакімава // Адукацыя і выхаванне. – 2000. – № 8. – С. 63–67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**29.** Лухверчик, В.Н. Становление и развитие среднего педагогического образования в дореволюционной Беларуси (вторая половина XIX – начало XX в.): дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / В.Н. Лухверчик. – Минск, 1997. – 115 л.
**30.** Медынский, Е.Н. Братские школы Украины и Белоруссии в XVI – XVII вв. и их роль в воссоединении Украины с Россией / Е.Н. Медынский. – М.: АПН РСФСР, 1954 – 176 с.
**31.** Мешчаракоў, У.П. Асветніцкая дзейнасць і педагагічныя погляды Францыска Скарыны / У.П. Мешчаракоў. – Мінск: Тавар-ва «Веды» Беларускай ССР, 1990. – 24 с.
**32.** Міцкевіч, К. Методыка роднай мовы: для педтэхнікумаў і настаўнікаў / К. Міцкевіч, В. Тэпін. – Менск: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1930. – 226 с.
**33.** Міцкевіч, К.М. Методыка роднае мовы / К.М. Міцкевіч. – Мінск: Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, 1926. – 142 с.
**34.** Нарысы гісторыі асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Г.Р. Сянькевіч [і інш.]; гал. рэд. С.А. Умрэйка. – Мінск: Нар. асвета, 1968. – 624 с.
**35.** Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР. Конец XIX – начало XX вв. / под ред. Э.Д. Днепрова [и др.]. – М.: Педагогика, 1991. – 448 с.
**36.** Панкевич, П.Я. Политехническая школа в связи с развитием современной крупной индустрии / П.Я. Панкевич. – Минск: 1-я тип. Белор. Госуд. Изд-ва, 1928. – 192 с.
**37.** Паўловіч, С.А. Аб арганізацыі Беларускае працоўнае школы / С.А. Паўловіч. – Вільня: Белар. друкарня імя Фр. Скарыны, 1928. – 18 с.
**38.** Паўловіч, С.А. Метадычныя ўвагі да пасобніка “Пішы самадзейна” / С.А. Паўловіч. – Вільня: Белар. друкарня імя Фр. Скарыны, 1929. – 18 с.
**39.** Паўловіч, С.А. Практыка выкладання прыродазнаўства ў пачатковай школе: падручнік для настаўнікаў і педагагічных тэхнікумаў / С.А. Паўловіч. – Менск: Выдавецтва Беларусі: Вучпедсектар, 1935. – 180 с.
**40.** Педагогика: Большая современная энциклопедия / сост. Е.С. Рапацевич. – Минск: Современное слово, 2005. – 720 с.
**41.** Подокшин, С.А.: Франциск Скорина / С.А. Подокшин. – М.: Мысль, 1981. – 215 с.
**42.** Полоцкий, С. Избранные сочинения / С. Полоцкий. – М.–Л.: АН СССР, 1953. – 282 с.
**43.** Полоцкий, С. Обед душевный / С. Полоцкий. // Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. – Минск, 1991. – С. 166–173.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

44. Психолого-педагогический словарь для учителей и руководителей общеобразовательных учреждений. – Ростов н/Д.: Феникс, 1998. – 544 с.
45. Родионов, В.Н. Якуб Колас – педагог / В.Н. Родионов. – Минск: Изд-во БГУ, 1981. – 141 с.
46. Савенко, Т.Н. Проблема формирования профессионального мастерства учителя в трудах педагогов Беларуси (50-90-е годы XX века): дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / Т.Н. Савенко. – Минск, 2002. – 121 л.
47. Скарына, Ф. Прадмовы і пасляслоўі / Ф. Скарына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 240 с.
48. Снапкоўская, С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 1998. – 192 с.
49. Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі: вучэб.-метад. дапам. / С.В. Снапкоўская. – Мінск: БДПУ, 2006. – 308 с.
50. Снапкоўская, С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічный думкі на Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск: Нар. асвета, 1995. – 128 с.
51. Станкевіч, А.: Доктар Францішак Скарына – першы друкар беларускі, 1525 – 1925 / А. Станкевіч. – Вільня: Беларускае навуковае таварыства, 1925. – 58 с.
52. Степанец, Б. Каким должен быть народный учитель по завету русской истории / Б. Степанец // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1910. – № 1 – С. 11–15.
53. Тарашкевіч, Б.А. Беларуская граматыка для школ / Б.А. Тарашкевіч. – Мінск-Вільня-Берлін: Вызваленне, 1921. – 64 с.
54. Тарашкевіч, Б.А. Беларуская граматыка для школ. 3-е выд. / Б.А. Тарашкевіч. – Вільня: Друкарня Віленскага Выдавецтва, 1920. – 64 с.
55. Тарашкевіч, Б.А. Выбранае: крытыка, публіцыстыка, пераклады / Б.А. Тарашкевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991. – 319 с.
56. Федиско, О.Н. Проблема педагогического мастерства в отечественной педагогике конца XIX – начала XX вв.: автореф. … дис. канд. пед. наук: 13.00.01; 28.03.05 / О.Н. Федиско. – Пятигорск, 2005. – 21 с.
57. Федотова, И.Б. Педагогическая деятельность и педагогические взгляды К.В. Ельницкого (1846 – 1917): автореф. … дис. канд. пед. наук: 13.00.01; 25.05.2000 / И.Б. Федотова. – Пятигорск, 2000. – 20 с.
58. Хрестоматия по истории педагогики / сост. И.Е. Лакин [и др.]. – Минск: Вышэйш. шк., 1971. – 610 с.
59. Ціток, З. Беларусізацыя як адраджэнне беларускай нацыянальнай школы (20-я гады 20 ст.) / З. Ціток // Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне: тэзісы навук. дакл. на міжнар. канф., Мінск, 25–26 кастр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1994 г.: у 2 ч. / НІА; рэдкал.: Ул. Гарыцкі [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 53–54.

**60.** Шухлёў К.В. Гісторыя школьнай справы на Беларусі ў XIX – пач. XX ст. / К.В. Шухлёў // Актуальные проблемы теории и истории педагогики: пед. чтения, посвящ. памяти доц. С.В. Селицкого, Витебск, 2 февр. 2006 г. / ВГУ им. П.М. Машерова; под ред. В.В. Тетериной [и др.]. – Витебск, 2006. – С. 76–81.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест

Уводзіны........................................................................................................ 3

I. Гістарычны агляд станаўлення паняцця «педагагічнае майстэрства» ў гісторыі асветы і педагагічнай думкі Беларусі (да канца XIX ст.)................................................................................................. 6

Праверым свае веды ................................................................................ 12

II. Праблема падрыхтоўкі настаўнікаў сярэдніх навучальных устаноў Беларусі ў пачатку XX ст........................................................................... 16

Праверым свае веды ................................................................................ 21

III. Погляды на праблему прафесійнага майстэрства настаўніка ў працах тэарэтыкаў педагагічнай навукі Беларусі ў першай трэці XX ст....................... 25

Праверым свае веды ................................................................................ 37

Працуем самастойна.................................................................................. 43

Адказы да тэстаў........................................................................................ 45

Літаратура.................................................................................................. 46

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ВУЧЭБНАЕ ВЫДАННЕ

***Садоўская** Інна Іванаўна*

# ПРАФЕСІЙНАЕ МАЙСТЭРСТВА НАСТАЎНІКА Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ

*Метадычныя рэкамендацыі*

***Частка 1***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Адказны за выпуск В.У. Юхнавец***

Падпісана ў друк 16.07.07. Фармат 60×84 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк Riso.Ум. друк. арк. 3,02. Ул.-выд. арк. 4,00. Тыраж 100 экз. Заказ 500.

*Выдавец і паліграфічнае выкананне:*
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка».*
*ЛИ №03220/0133496 ад 01.04.04*
*ЛП № 02330/0131508 ад 30.04.04*
*220050, Мінск, Савецкая, 18*

*Надрукавана з арыгінал-макет заказчыка* ў Вучэбна-выдавецкім цэнтры БДПУ.
220007, Мінск, Магілёўская, 37